Таким образом, структура организационной культуры включает поверхностный, подповерхностный и глубинный уровни. Ценности составляют основу организационной культуры и во многом определяют другие ее элементы, при этом ценности обусловливают организационное поведение членов организации и, таким образом, оказывают влияние на эффективность организационной деятельности в целом. При этом терминальные ценности организационной культуры отражают стратегические цели существования организации, тогда как инструментальные ценности представляют собой важные для данной организации качества персонала и характеристики внутренней среды, позволяющие достигнуть терминальных ценностей. Ключевую терминальную ценность существования конкретной организации выражает ее миссия. Наибольшая эффективность деятельности организации достигается при совпадении официально декларируемых ценностей с реально разделяемыми работниками ценностями.

Список использованных источников

1. Грошев, И. В. Организационная культура / И. В. Грошев, П. В. Емельянов, В. М. Юрьев. – М.: Юнити-Дана, 2004. – 288 с.

2. Кравченко, А. И. Социология управления / А. И. Кравченко, И. О. Тюрина. – М.: Академ. проект, Деловая книга, 2008. – 983 с.

3. Семенов, Ю. Г. Организационная культура / Ю. Г. Семенов. – М.: Логос, 2006. – 255 с.

4. Стеклова, О. Е. Организационная культура: учеб. пособие / О. Е. Стеклова. – Ульяновск: УлГТУ, 2007. – 127 с.

5. Ценностные ориентации белорусского студенчества: сравнительный социологический анализ (1998–2009 гг.) / П. И. Бригадин [и др.]; под ред. П. И. Бригадина, И. В. Левицкой. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2010. – 207 с.

6. Шейн, Э. Организационная культура и лидерство / Э. Шейн. – СПб.: Питер, 2002. – 335 с.

7. Debats, D. L. The structure of human values: a principal components analysis of the Rokeach Value Survey (RVS) / D. L. Debats // Meaning in life: psychometric, clinical a. phenomenological aspects / D. L. Debats. – Enschede, 1996. – P. 47–58.

References

1. Groshev I. V., *Organizatsionnaia kul'tura* [Organizational culture], Yuniti-Dana, Moscow, RU, 2004.

2. Kravchenko A. I., *Sotsiologiia upravleniia* [Sociology of management], Akademicheskii proekt, Delovaia kniga,Moscow, RU, 2008.

3. Semenov Y. G., *Organizatsionnaia kul'tura* [Organizational culture], Logos, Moscow, RU, 2006.

4. Steklova O. Y., *Organizatsionnaia kul'tura: uchebnoe posobie* [Organizational culture: tutorial], UlGTU, Ulyanovsk, RU, 2007.

5. *Tsennostnye orientatsii belorusskogo studenchestva: sravnitel'nyi sotsiologicheskii analiz (1998–2009 gg.)* [Value orientations of Belarusian students: comparative sociological analysis (1998–2009)], GIUST BGU, Minsk, BY, 2010.

6. Schein E., Organizatsionnaia kul'tura i liderstvo [Organizational culture and leadership], Piter, St. Petersburg, RU, 2002.

7. Debats D. L., Bartelds B. F., "The structure of human values: A principal component analysis of the Rokeach Value Survey", in D. L. Debats (ed.), *Meaning in life: Psychometric, clinical and phenomenological aspects*, 1996, pp. 41–83.

Информация об авторе

Шухно *Евгений Валерьевич* – аспирант, магистр социол. наук. ГНУ «Институт социологии НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: eshuhno@mail.ru.

Information about the author

Shukhno *Yevgeniy Valeryevich*, Postgraduate, MA (Sociol.), Institute of Sociology, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: eshuhno@mail.ru.

Для цитирования

Шухно, Е. В. Ценности как ключевой компонент организационной культуры / Е. В. Шухно // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 3. – С. 34–39.

For citation

Shukhno, Ye. V. Values as a Key Component of Organizational Culture / Ye. V. Shukhno // Proc. Natl. Acad. Sci. Belarus: Hum. Ser., no. 3, 2017, pp. 34–39.

ISSN 1024-5928 (print)

ГІСТОРЫЯ

HISTORY

УДК [929 (476)Скарына+655.11 (476) (092)Скарына]:930.2«14/15»

Паступіў у рэдакцыю 16.05.2017
Received 16.05.2017

А. А. Жлутка

Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

На основании письменных источников XV–XVI вв. освещается биография белорусского и восточнославянского первопечатника Франциска Скорины. Автором исследованы также малоизвестные и главные периоды жизненного пути первопечатника и просветителя. Рассматриваются гипотезы о дате его рождения и смерти, о месте начального образования. Излагаются документальные сведения о его семье и родственниках, жене и сыновьях. В научный оборот вводятся новые сведения, почерпнутые из документальных и архивных материалов. На их основе приводятся новые аргументы в пользу получения Скориной ступени доктора свободных искусств и основательного медицинского образования в Копенгагенском университете. Выдвигается также предположение о его участии в датской делегации на V Латеранский собор в Риме летом 1512 г. за три месяца до докторских экзаменов по медицине в Праге. Автор также считает возможным отождествить безымянного медика, написавшего медицинское сочинение о средствах против «потной чумы», которое было послано герцогом Альбрехтом Прусским королевскому канцлеру Криштофу Шидловецкому со Скориной. Сообщается также о выявлении двух новых документов в архивах Чехии, касающихся сына первопечатника – Симеона.

Ключевые слова: история, источниковедение, письменные источники, письменность, архивные материалы, Франциск Скорина, книгопечатание, Библия.

A. A. Zhlutka

Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

UNKNOWN PAGES OF FRANCISK SKORINA'S BIOGRAPHY

The biography of Francisk Skorina, the first Belarusian and East Slavic book printer, is addressed on the basis of documentary sources of the 15th and 16th centuries. The author also explores both blank spots and major periods in the life of the first book printer and enlightener. Hypotheses are considered regarding the dates of his birth and death and the place of his primary education. Documentary information is presented about his family and relatives, his wife and sons. The scientific community is supplied with new information obtained from documentary and archive materials. On their basis, new arguments are presented in favour of Skorina's obtaining his degree of Doctor of Liberal Arts and solid medical education at Copenhagen University. It is also suggested that he participated in the Danish delegation to the Fifth Council of the Lateran in Rome in the summer of 1512 three months before his doctoral examinations in medicine in Prague. The author also deems it possible to identify Skorina as the one who wrote the anonymous medical essay on how to cure the sweating sickness that was sent by Albert, Duke of Prussia, to the Great Chancellor of the Crown Krzysztof Szydłowiecki. Besides, two new documents in the archives of the Czech Republic are reported as related to the first printer's son, Simeon.

Keywords: history, source criticism, narrative sources, writing system, archive materials, Francisk Skorina, book printing, Bible.

Сёлета спаўняецца 500-гадовы юбілей выхаду ў свет першай беларускай друкаванай кнігі – перакладу Бібліі, здзейсненага славутым беларускім і ўсходнеславянскім першадрукаром Францыскам Скарынам.

Нягледзячы на вялікую працу, праробленую некалькімі пакаленнямі даследчыкаў, у біяграфіі Скарыны ўсё яшчэ існуюць істотныя прагалы. Дагэтуль не ўстаноўлены дакладныя даты яго нараджэння і смерці. Невядома, дзе канкрэтна ён здабываў веды, неабходныя для паступлення ў Кракаўскі ўніверсітэт і для бліскучай абароны ступені доктара медыцыны ў Падуі. Пакуль

© Жлутка А. А., 2017

не знойдзены звесткі пра пяцігадовы прамежак жыцця Скарыны пасля падуанскай абароны ў 1512 г. да пачатку друкавання кніг Бібліі ў Празе ў 1517 г. Няпэўным застаецца час пасля апошняй згадкі пра яго як каралеўскага садоўніка ў 1539 г. і да 1552 г., калі ягоны сын Сымон атрымаў ад Фердынанда I ліст на маёмасць, пакінутую пасля смерці Францыска Скарыны. Праліць хоць нейкае святло на гэтыя лакуны ў жыццяпісе першадрукара могуць пакуль што толькі ўскосныя пісьмовыя сведчанні.

Прыблізнай датаю нараджэння Францыска прынята лічыць 1490 г., адштурхоўваючыся ад часу яго паступлення ў Кракаўскі ўніверсітэт у 1504 г. Гэта крайні тэрмін, паколькі ва ўніверсітэт маглі паступаць не раней, як з 14 гадоў. Але выдатная абазначанасць у кірылічным пісьменстве і ў богаслужэбнай літаратуры ўсходняга абраду, а таксама добрыя веды лацінскай мовы, што дазволіла паспяхова паступіць у Кракаўскі ўніверсітэт, але патрабавала б болей часу, схіляюць да дапушчэння пра больш сталы ўзрост юнака ў час паступлення – каля 17–18 гадоў. Магчыма, недалёкі ад праўды быў знакаміты беларускі мастацтвазнавец Мікола Шчакаціхін, калі прапанаваў іншую дату – 6 сакавіка 1486 г., патлумачыўшы друкарскую эмблему Скарыны «Сонца маладзіковае» як указанне на дзень нараджэння ў момант сонечнага зацьмення ў Полацку [1]. Нягледзячы на ўсю няпэўнасць трактавання эмблемы як указання на момант з'яўлення дзіцяці на свет, 1485–1486 гг. падаюцца больш адпаведным часам нараджэння Францыска.

Няшмат вядома таксама пра сям'ю Скарынаў. У інструкцыі Маскоўскага князя Івана III паслу Івану Беклямешаву да караля Польшчы і вялікага князя ВКЛ Казіміра IV Ягелончыка з 18 мая 1492 г. згадваецца полацкі купец Лук'ян Скарына [2, с. 45]. Сынам Лукі названы Францішак у запісе пры паступленні ў Кракаўскі ўніверсітэт (1504 г.) [2, с. 57.]. У актах абароны ступені доктара медыцыны ў Падуі перад імем бацькі стаіць займеннік quondam – «калісьці», «раней», які ў такіх выпадках у лацінскіх крыніцах азначаў памерлых [2, с. 63–72]. Гэта дазваляе меркаваць, што ў 1512 г. бацькі, Лукі Скарыны, ужо не было ў жывых. Дагэтуль не знойдзены дакументальныя сведчанні пра маці Францішка. У дэкрэце караля і вялікага князя Жыгімонта I са снежня 1518 г. згадваецца брат Іван як сведка на судзе Андрэя са Львова супраць віленскага грамадзяніна Дашкі [2, с. 46]. Як вынікае з запісаў прэтэнзій крэдытораў на маёмасць Івана ў Познані, ён памёр перад ліпенем 1529 г. Як і бацька, ён займаўся гандлем, пераважна гандлем скурамі. У судовых справах па маёмасці Івана ў Познані, а таксама ў справах па нерухомасці ў Полацку фігуруе імя яго сына Рамана. У Познані Раман з'явіўся асабіста два разы: увосень 1529 г., калі як законны спадкаемец разлічваўся з крэдыторамі свайго бацькі Івана, і ўвесну 1532 г., калі вызваляў з познанскай вязніцы свайго роднага дзядзьку Францішка. У познанскай судовай справе 1532 г. адзначана, што Раман прыбыў на суд з Гданьска, а ў справе па маёмасці ў Полацку ў 1535 г. сказана, што ён «в Немъцах служить» [2, с. 112–115, 123, 128–132]. Магчыма, і ў другім выпадку меўся на ўвазе Гданьск, які доўгі час быў пад уладаю немцаў, альбо нейкі іншы горад Заходняй ці нават Цэнтральнай Еўропы, улічваючы шматзначнасць у той час тэрміна «немцы». У кожным выпадку не выключана, што ў архівах Гданьска могуць захоўвацца нейкія матэрыялы пра Рамана, а магчыма, і пра ягонага бацьку і дзядзьку. Апрача сына, Іван меў яшчэ дзвюх не названых па імені дачок, бо ў полацкай справе 1535 г. пра яго маёмасць згадваюцца два ягоныя зяці Еська Стэпановіч і Міхна Аўсянікаў. Еська Стэпановіч, апрача полацкай уласнасці цесця, прэтэндаваў таксама і на частку яго познанскай маёмасці раней у справе 1529 г. [2, с. 49–50]. Ён жа прадстаўлены і ў актах полацкай рэвізіі 1552 г. У гэтых актах фігуруе таксама ігумен Пятніцкага манастыра Васка Скарына, а таксама Еська Скарына, які браў удзел як полацкі райца ў пасольстве ў Рыгу ў 1553 г. [2, с. 51–53]. Невядома, ці яны былі родзічамі Францыска Скарыны.

Імя Скарыны Францыск ускосна ўказвае на яго канфесійную прыналежнасць, а таксама на месца, дзе ён мог здабыць веды з лацінскай мовы, неабходныя для паступлення ва ўніверсітэт. Святы Францішак Асізкі, якому ён абавязаны сваім імем, як вядома, быў заснавальнікам і патронам Ордэна братоў меншых, ці францысканцаў, што пачалі прапаведваць неўзабаве пасля свайго заснавання таксама на тэрыторыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага яшчэ ў XIII ст. Рэфармаванае іх адгалінаванне – францысканцаў-абсервантаў – было заснавана Бернардзінам з Сіены (1380–1444 гг.), які заклікаў сваіх паслядоўнікаў займацца прапаведваннем і навучаннем. Летам 1453 г. на запрашэнне караля Казіміра IV Ягелончыка і кракаўскага біскупа Збігнева

Алесніцкага ў Кракаў на чале са знакамітым прапаведнікам Янам Капістранам прыбылі некалькі манахаў з гэтай супольнасці. За восем месяцаў побыту Капістрана да абсервантаў было прынята 130 новых членаў, пераважна з ліку выкладчыкаў і студэнтаў Кракаўскага ўніверсітэта [3, p. 466; 4, s. 10]. Адразу ж пачалося будаўніцтва кляштара, прысвечанага Бернардзіну з Сіены. Ад назвы кляштара францысканцы-абсерванты ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім сталі называцца бернардзінцамі, у адрозненне ад нерэфармаваных канвентуальных францысканцаў. Супольнасць імкліва развівалася, узніклі кляштары на тэрыторыі Польшчы і Украіны, а ў 1468 г. быў заснаваны кляштар у Вільні. Пазней, у 1498 г. у Полацку таксама быў заснаваны бернардзінскі кляштар, прысвечаны Найсвяцейшай Панне Марыі з касцёлам св. Францішка. Адміністрацыйна віленскі і полацкі кляштары ўваходзілі ў склад Польскага вікарыяту (з 1517 г. – Польскай правінцыі) францысканцаў-абсервантаў з цэнтрам у Кракаве.

Бернардзінцы вылучаліся тым, што прызнавалі правамоцнымі ўсе праваслаўныя таемствы, апрача веравызнання, і не патрабавалі перахрышчэння [4, s. 143]. Шмат у чым іх дзейнасць была скіравана на паяднанне дзвюх галін хрысціянства: праваслаўя і каталіцтва. Выказвалася нават меркаванне, што менавіта бернардзінцы паспрыялі выданню ў 1491 г. у Кракаве *Актоіха* Швайтполем Фіёлем. Прынамсі, да гэтага выдання меў непасрэднае дачыненне сіндык кракаўскага канвента бернардзінцаў Ян Турзан [5, s. 171]. Тое, што Скарына атрымаў хроснае імя ад патрона бернардзінцаў і пазней дзейнічаў у гэткім жа самым экуменіцкім кірунку, выдаючы Святое Пісьмо і богаслужэбныя кнігі для праваслаўных вернікаў, дадаткова сведчыць пра яго сувязі з полацкімі бернардзінцамі і навучанне ў іх. Вельмі верагодна, што з іх дапамогаю ён стаў таксама студэнтам Кракаўскага ўніверсітэта. Яго апекуном і натхняльнікам на гэтым шляху мог быць Лявон з Ланьцута (горад знаходзіўся на ўсходзе ад Кракава, уваходзіў у склад Рускага ваяводства, цэнтрам якога быў Львоў). Лявон быў манахам у Кракаве, дзе дакументальна засведчаны ў 1484 г. і дзе ў 1525 г. памёр. Ён стаў першым гвардыянам полацкага кляштара і кіраваў ім каля 15 гадоў (1498–1512?) [4, s. 179]. Потым нейкі час (да 8 снежня 1512 г.) [4, s. 182] быў кусташам Віленскага канвента. Па справах полацкага кляштара ён павінен быў мець пастаянныя стасункі з Кракавам. Таксама ў сталіцу вікарыяту Лявон з Ланьцута быў абавязаны з'яўляцца падчас капітулаў, якія адбываліся штогод і найчасцей у Кракаве ды прымяркоўваліся альбо да свята Спаслання Духа Святога, альбо да свята Багародзіцы 8 верасня і трывалі два тыдні ці нават болей [4, s. 80–81]. Стала прабываць у Кракаве ён павінен быў прынамсі ў 1512–1514 гг., калі з'яўляўся кіраўніком Польскага вікарыяту бернардзінцаў, а таксама ў 1517–1520 гг., калі займаў пасаду правінцыяла Польскай правінцыі [4, s. 61]. Сувязі полацкіх бернардзінцаў з Кракавам, а кракаўскіх – з Ягелонскім універсітэтам і маглі паспрыяць паступленню туды Францыска Скарыны. Магчыма, пошукі ў бернардзінскіх архівах змаглі б праліць святло на гэты перыяд у яго біяграфіі.

Францыск Скарына паступіў у Кракаўскі ўніверсітэт у 1504 г. у час рэктарства Яна Аміцына, пра што сведчыць запіс у матрыкулах за зімні семестр. У ліку 120 упісаных у матрыкулярную кнігу значацца «Францыск, [сын] Лукі з Плоцка (Полацка), [уступная плата] 2 грошы» і яшчэ тры асобы з Беларусі: «Венцэслаў, [сын] Венцэслава са Слуцка Віленскай [дыяцэзіі], 4 грошы»; «Юрый, [сын] Якуба з Валкавыска, 2 грошы»; «Мікалай, [сын] Андрэя з Ашмянаў, 7 грошаў» [6, p. 90–91]. Уступны грашовы ўнёсак вагаўся ад 1 да 8 грошаў. Зыходзячы з сумы, унесенай Скарынам, можна меркаваць, што падчас навучання ён жыў у бурсе для бедных. У кнізе прамоцый філасофскага факультэта, на якім вучыўся Францыск Скарына, пад датаю 14 снежня 1506 г. у час дэканства магістра Леанарда з Добшыцаў змешчаны запіс пра наданне ступені бакалаўра: «узведзеныя на ступень бакалаўра і размеркаваныя ў наступным парадку паводле месца:... Фран (цыск) з Полацка, літвін...» У гэты ж дзень разам са Скарынам атрымалі ступень бакалаўра яшчэ пятнаццаць шкаляроў, два з якіх – Тамаш з Падляшша і Якуб з Эльбінга – у 1504 г. разам з ім паступалі ва ўніверсітэт і былі ўнесеныя ў матрыкулы [7, p. 144].

Дакладна невядома, дзе знаходзіўся Скарына з канца 1506 да восені 1512 г., калі ягонае імя будзе ўпісана ў акты надання акадэмічных ступеняў Падуанскага ўніверсітэта. У Падую ў 1512 г. ён прыбывае ўжо з тытулам доктара вольных навук [8, p. 243–346] і набывае ў падуанскім універсітэце яшчэ адну вучоную ступень – доктара медыцыны. За час паміж дзвюма гэтымі датамі Францыск Скарына мусіў стаць не толькі доктарам вольных навук, але яшчэ атрымаць выдатную

медыцынскую адукацыю. Апрача таго, у апошнім падуанскім дакуменце ад 9 лістапада 1512 г. пра наданне знакаў ступені доктара медыцыны ён названы сакратаром дацкага караля–secretarius regis Datiae. Да апошняга часу вяліся спрэчкі наконт тэрміна Datia, які ў старажытных пісьмовых крыніцах ужываўся ў адносінах да колішняй рымскай правінцыі Дакіі (сёння тэрыторыя Румыніі), але ў часы Скарыны гэтая назва азначала ўжо іншую краіну – Данію, дарэчы дакладна гэтак жа rex Datiae называе сябе сам тагачасны кароль Даніі Ёган-Ганс у дакументах, выдадзеных ад яго імя. Беларускія скарыназнаўцы Георгій Галенчанка [9, с. 94; 10, с. 19–20], Віктар Дарашкевіч [2, с. 10], Вітаўт Тумаш [11, с. 18] ужо даўно ўказвалі, што пад гэтым тэрмінам хаваецца менавіта дацкае каралеўства. Нядаўна гэтае пытанне яшчэ раз грунтоўна прааналізавала Вольга Шутава, прыйшоўшы да такога ж меркавання [12, p. 27]. Найбольш верагодна, што менавіта ў Даніі Францыск Скарына атрымаў ступень доктара вольных навук і выдатныя веды ў медыцыне. На той час у Капенгагене ўжо дзейнічаў адкрыты ў 1479 г. Хрыстыернам I першы дацкі ўніверсітэт з чатырма факультэтамі, адным з якіх быў медыцынскі.

Якім чынам Скарына, сакратар дацкага караля, апынуўся ў Італіі? Вядома, што выпускнікі медыцынскага факультэта з Капенгагенскага ўніверсітэта для доктарскай абароны выбіралі звычайна альбо Падую, альбо Манпелье. Апрача таго, каралеўскія сакратары даволі часта выконвалі адказныя дыпламатычныя даручэнні. Таму, на нашу думку, ён прыбыў у Італію ў складзе нейкай дыпламатычнай місіі. Здаецца, гэта пацвярджае новавыяўленае нядаўна пісьмовае сведчанне. Гэта адзін з запісаў у дзённіку папскага цырымоніймайстра Парыса Грасі. Арыгінал часткі дзённіка за 1512 г., дзе змешчаны гэты запіс, паводле нашых звестак, не захаваўся, а вядомы з шэрага копій за гэты год і таксама за іншы час, якія захоўваюцца ў Ватыканскім сакрэтным архіве (10 рукапісаў), у Ватыканскім архіве Аддзела літургічных цэлебрацый найвышэйшага пантыфіка (14 рук.), Апостальскай бібліятэцы ў Ватыкане (38 рук.) [13, гл.: 14 рук. за 1512 г. з Ватыканскіх архіваў і бібліятэкі], у бібліятэках Рыма: Ангеліцы (1 рук.), Валічэліяне (1 рук.), Казанатэнскай (6 рук.), Камунальнай бібліятэцы архігімназіі ў Балоньі (4 рук.), Баварскай дзяржаўнай бібліятэцы ў Мюнхене (3 рук.), Нацыянальнай бібліятэцы Францыі ў Парыжы (2 рук.). З самай ранняй копіяй у Казанатэнскай бібліятэцы г. Рыма пашчасціла папрацаваць і нам. Запіс датуецца 6 жніўня 1512 г., г. зн. за тры месяцы да надання Скарыне ступені доктара медыцыны ў Падуі.

Парыс Грасі распавядае пра прыём папам Юліем II у той дзень трох дацкіх пасланнікаў, якія ўсе былі дактарамі і простымі канонікамі: адзін з іх прысяглы сакратар караля, двое іншыя – каралеўскія прыдворныя [14, f. 35v]. Вядома, што ўвесну таго ж года ў Рыме, у Латэранскай базіліцы, распачаўся V Латэранскі сабор. Гаворка пра сабор ішла і 6 жніўня, таксама ва ўзнёслай прамове, з якой звярнуўся да папы ад імя караля Ганса ягоны, не названы па імені, сакратар. Сярод іншага, выказаўшы паслушэнства папу з боку караля Даніі і Шатландыі ды іх жаданне далучыцца да сабору, ён паведаміў, што: «нават уладар русінаў і цар татараў і готаў, якія ніколі раней не апускаліся да прызнання ніводнага сабору, прыкладзе намаганні, каб цяпер яны (г. зн. русіны, татары і готы. – *А. Ж.*) далучыліся да сабору, што будзе прызначаны папам, альбо пагадзіліся з ужо прызначаным, просячы дапусціць іх да ўхвалення дэкрэтаў і пераўладкавання Горада, Свету і Касцёла» [14, f. 35v].

Гаворка ў гэтым пасажы ідзе, безумоўна, пра вялікага князя Масковіі Васіля III. Маскоўскія вялікія князі і дацкія каралі ад XV ст. імкнуліся да палітычных альянсаў, складаючы дамовы «аб хаўрусе і сяброўстве», з аднаго боку, супраць Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы, з другога – супраць Швецыі і Ганзейскага саюзу. У лістападзе 1493 г. падобную дамову ўклалі маскоўскі князь Іван III і дацкі кароль Ёган-Ганс. Апрача ваеннага хаўрусу, накіраванага ў першую чаргу супраць шведскага ўладара Стэня Стура і Вялікага Княства Літоўскага, яна прадугледжвала свабодны праезд паслоў, узаемную выдачу перабежчыкаў (нявольнікаў і нявольніц, даўжнікоў, злодзеяў, рабаўнікоў), бесперашкодны гандаль маскоўскіх купцоў у Даніі і дацкіх у Масковіі [15, с. 1, № 2]. Тое, што дамова выконвалася, паказваюць дакументы з пазнейшага часу. Прыкладна праз год у сувязі з блізкім абраннем яго на пасаду караля Швецыі Ганс просіць Івана III на год ці на два ўстрымацца ад варожых дзеянняў супраць Швецыі [15, с. 2 (спасылка)] . У 1501 г. маскоўскія паслы вялі перагаворы ў Даніі наконт урэгулявання памежных непаразуменняў, абмену палоннымі, прыслання ў Масковію дацкіх майстроў, а таксама пытанне магчымага шлюбу сына маскоўскага ўладара Васіля з дацкай прынцэсай Альжбетай [15, с. 2, № 3]. У 1506 г. Васіль, ужо як вялікі князь

Васіль III, выказвае жаданне ўкласці новую міждзяржаўную дамову і выпраўляе дзеля гэтага да Ганса свайго пасла Істому [15, с. 3, № 4]. Кароль пагаджаецца аднавіць дамову і паведамляе Васілю III пра здраду і паўстанне ў Швецыі, а таксама просіць яго дапамагчы [15, с. 4, № 5]. Дамова была абноўленая ў тым жа 1506 г. [15, с. 4, № 6]. У дакументах з 1508, 1509, 1510, 1513 гг. называецца імя дацкага пасланніка, выпраўленага каралём Гансам, а потым яго наступнікам на дацкім троне Хрысціернам II у Масковію: магістра Давіда ван Корана [16, s. 1118, nr. 9322; s. 1128, nr. 9408; s. 1141, nr. 9515; s. 1180, nr. 9892]. У наступным 1514 г. у Данію з даверным лістом выпраўляюцца паслы Васіля III: баярскі сын Іван Мікулін Забалоцкі і дзяк Васіль Аляксандраў [15, с. 6, № 12].

Нягледзячы на дамовы з Масковіяй, Ёган-Ганс паралельна наладжваў дыпламатычныя стасункі таксама з Польшчаю і Вялікім Княствам Літоўскім. У 1505 г. была ўкладзена дамова «Пра дружбу і хаўрус найяснейшага пана Ёгана, караля Данii, Швецыі і Нарвегіі, з найяснейшым Жыгімонтам, каралём Польшчы, і паміж падданымі і ўладаннямі абедзвюх дзяржаў» [17, s. 94, nr. 10501-2]. У 1506 г. з даверным лістом выправіўся да караля Польшчы і вялікага літоўскага князя Аляксандра той жа самы магістр Давід [18, s. 4, nr. 4]. У 1507 г. з Польшчы вяртаецца іншы дацкі пасланнік Вернэр Каннік [16, p. 1114, nr. 9285]. Апрача таго, рабіліся спробы завязаць матрыманіяльныя адносіны: так, пры выбары нявесты для дацкага каралевіча Хрысціерна ў 1508 г. абмяркоўвалася кандыдатура дачкі польскага караля [18, s. 19–20, nr. 30]. Праз год у Данію выправіўся дарадца і пасол Жыгімонта Ян Кокрыц: паміж абедзвюма дзяржавамі была ўкладзена дамова «пра сяброўства, любоў і хаўрус», засведчаная некалькімі дакументамі з абодвух бакоў, адбыўся абмен пасламі [18, s. 25, nr. 36; 19, s. 61, nr. 14; 20, p. 355–357]. Дамова будзе абноўленая ў 1516 г. пры наступніку Ганса Хрысціерне II [21, p. 38, nr. 42; p 57, nr. 62; 73–74, nr. 88, 89]. Вельмі верагодна, што з адным з такіх пасольстваў у Данію і мог патрапіць Скарына ў прамежку паміж 1506 і 1510 гг. Звычайна лічыцца, што Скарына мог прыбыць у Данію ў 1509 г. падчас укладання хаўруснай дамовы. Але нічога не перашкаджае нам дапусціць, што ён мог апынуцца там і раней, нават адразу пасля атрымання ступені бакалаўра ў Кракаве. Тым больш, што ў Капенгагенскім універсітэце на пачатку яго дзейнасці адчуваўся недахоп як студэнтаў, так і выкладчыкаў, і для прыцягнення іх у Капенгагенскую альма-матар адмыслова выязджалі за мяжу прадстаўнікі караля і ўніверсітэта [22, p. 9–10, 23–24].

У згаданым запісе Парыса Грасі адзначаецца пра імкненне Масковіі да паразумення з Апостальскім Пасадам і пра далучэнне да V Латэранскага сабору. У атачэнні Васіля III, сына Івана III і грачанкі Соф'і Палеалог, якую, дарэчы, лічаць каталічкай усходняга абраду, безумоўна, абмяркоўвалася і пытанне рэлігійнай уніі. Прыхільнікамі ўніі пры двары Васіля III, апрача ягонай маці, былі прыдворны лекар Мікола Булеў, захавальнік маскоўскага скарбу і дзяржаўнай пячаці грэк Юры Траханіёт, а таксама яго ўплывовы бацька Дзмітрый Траханіёт ды іншыя. Замежныя паслы, напрыклад, пасол Нямецкага ордэна Шонберг і пасол імператара Францэска дэ Колё паведамлялі ў той час, што Масковія гатова прыняць унію. Пра гэта пісаў да папы Юлія II і кароль Шатландыі Якаб IV: «прыбылі нядаўна да караля Данii паслы імператара Русі, якія прасілі саюзу і сяброўства, і ён з вялікай надзеяй на гэты саюз ды на тое, што імператар звернецца да святога вучэння Рымскага Касцёла, зычліва прыняў яго просьбы і рыхтаваўся паслаць сваіх паслоў на Русь, якія б душу імператара ўзнялі ад забабоннай бязбожнасці, паказалі на марнасць веравызнання гэтага люду, ды ўвялі яму ў вушы сапраўдную Хрыстовую веру» [23, p. 85, nr. 45]. У запісе Парыса Грасі мы бачым, што дацкі кароль, выступаючы пасрэднікам перад папам, не пакідаў сваіх спроб схіліць маскоўскага ўладара да паяднання дзвюх галін хрысціянства. Але, відаць, справа ўніі была занядбана пасля амаль адначаснай смерці ў 1513 г. караля Ганса і папы Юлія II.

Пакуль не выяўлены дакументы аб пайменным складзе дацкай дыпламатычнай місіі на V Латэранскі сабор, скліканы папам Юліем у 1512 г., мы не можам з упэўненасцю сцвярджаць, што сакратаром, прадстаўленым у тэксце Грасі, быў Скарына. Але храналагічная блізкасць дзвюх згадак пра каралеўскага сакратара, змест прамовы перад папам, які закранаў пытанні, якія маглі быць у кампетэнцыі Скарыны, і ўказанне на яе красамоўнасць (ці не таму, што яе прамаўляў доктар вольных навук) дазваляе лічыць гэта вельмі верагодным. Дадатковым аргументам на карысць такога дапушчэння можа з'яўляцца прысутнасць, нягледзячы на цяжкую хваробу ног, біскупа Падуі і прэзідэнта ўніверсітэта, віцэ-канцлера папскай канцылярыі, пляменніка папы Юлія II, і ўдзельніка V Латэранскага сабору кардынала-прэзбітэра Сікста Гара дэла Равэрэ ў Падуі на

іспытах, якія трымаў Францыск Скарына. Магчыма, ён быў галоўным апекуном, які наладзіў і падтрымаў абарону Скарынам дысертацыі доктара медыцыны. На першы погляд, можа бянтэжыць тое, што сакратар і двое іншых пасланнікаў названы ў дзённіку Грасі канонікамі, але трэба зазначыць, што свецкімі канонікамі маглі быць магістры і дактары, у тым ліку і вольных навук. Для ўтрымання выкладчыкаў, апрача платы ад студэнтаў, маглі прызначацца кананікаты, г.зн. удзел у прыбытках, якія атрымліваў нейкі касцёл. Прычым такія кананікаты маглі прызначацца не толькі па месцы знаходжання навучальнай установы, але таксама і на радзіме прафесараў [24, с. 79–80].

Узнікае пытанне: навошта патрэбен быў Скарына дацкаму каралю ў якасці сакратара, бо вядома, што ў яго было шмат сваіх, айчынных? Пра гэта можа сведчыць, напрыклад, ліст Ёгана да папы Юлія II ад 11 лютага 1507 г., дзе ён просіць перадаць Шлягзвіскую прэпазітуру ды іншыя касцёльныя бенефіцыі свайму сакратару Гайну ды іншым сваім сакратарам [18, p. 16, nr. 24]. Сакратароў ён выкарыстоўваў у тым ліку і для дыпламатычных місій. Так, у тым жа годзе ён выдае даверны ліст свайму сакратару Ціху, сыну Вінцэнта, да караля Шатландыі Якаба IV [25, p. 248–249, nr. 43]. І ў тым жа 1507 г. Ёган просіць Людовіка XII, караля Францыі, рэкамендаваць згаданага Ціху, свайго сакратара, накіраванага ў Парыжскі ўніверсітэт, якому-небудзь вучонаму сябру каралеўскага парламента, каб ён вывучыў звычаі парламента і французскую мову [18, p. 19, nr. 29]. У 1510 г. згадваецца імя сакратара магістра Эрыка Валькэндорпа, якога Ганс просіць у папы Юлія прызначыць Нідроскім біскупам [18, p. 36, nr. 49]. У дакуменце ад 1510 г. фігуруе ў якасці сакратара, пасланага ў Масковію, ужо вядомы нам магістр Давід [16, p. 1144, nr. 9543]. Два каралеўскія сакратары Андэрс Глоб і Ёган Вульф згадваюцца ў двух дакументах, выдадзеных дацкім каралём 5 красавіка 1512 г. перад самым пачаткам V Латэранскага сабору [18, p. 49, nr. 74; 8, p. 1171, nr. 9805]. Ёган Вульф накіраваўся у Вечны Горад дзеля атрымання дыспенсацыі з дапамогаю Сенгаленскага кардынала, для каралеўскага канцлера на займанне двух касцёльных бенефіцый. Паводле некаторых меркаванняў, Ёган Вульф меўся узначальваць таксама дацкую місію на Латэранскі сабор. Як бачым, у дацкага караля не бракавала айчынных сакратароў. Тым не менш, адносіны з Масковіяй, Польшчаю і Вялікім Княствам Літоўскім патрабавалі мець пры сабе людзей, якія валодалі б «рускай» моваю і кірылічным пісьмом. Яшчэ больш такія асобы былі неабходныя для пасольстваў у пытаннях паяднання дзвюх галін хрысціянства і кансалідацыі еўрапейскіх краін перад турэцкай пагрозаю, якая тады была актуальнай і вымагала прыцягнення да антытурэцкай кааліцыі Масковіі, Вялікага Княства і Польшчы. Пра тое, што ў караля Ганса была патрэба ў такіх знаўцах, сведчыць яго недатаваны ліст, найверагодней ад 1506 г., да Васіля III з просьбаю прыслаць да яго палоненага фіна Сівара, які ведае «рускую» мову і пісьмо ды можа служыць перакладчыкам [26, s. 97, nr. 150].

Патрапіць у Данію Скарына мог, як ужо адзначалася, альбо ў 1509 г., калі туды выправілася пасольства караля Польшчы і вялікага князя ВКЛ Жыгімонта I, альбо раней пасля атрымання ступені бакалаўра ў Кракаве. На той час у Капенгагене ўжо дзейнічаў адкрыты ў 1479 г. Хрыстыернам I першы дацкі ўніверсітэт з чатырма факультэтамі, сярод якіх быў і медыцынскі. Менавіта тут Францыск Скарына мог здабыць ступень доктара вольных мастацтваў і выдатныя веды ў медыцыне, якія ён прадэманстраваў на абароне ў Падуі.

Вольга Шутава і Анатоль Цітоў, на аснове аналізу выдавецкіх сімвалаў Скарыны і дацкага першадрукара Говарта ван Гемена, указалі на іх відавочную сувязь і адначасовае знаходжанне ў Капенгагене і тым самым прывялі яшчэ адзін довад на карысць сакратарства Францыска Скарыны менавіта ў дацкага караля [27, с. 72–74; 28, с. 40].

Пытанне пра тое, ці Скарына быў у складзе дацкай дыпламатычнай місіі на V Латэранскі сабор і ці менавіта ён звяртаўся з прамоваю да папы Юлія II 6 жніўня 1512 г., нягледзячы на шэраг ускосных довадаў, усё ж застаецца адкрытым да выяўлення прамых дакументальных сведчанняў. Далейшыя пошукі, на наш погляд, трэба было б праводзіць у Ватыканскім сакрэтным архіве сярод дакументаў папы Юлія II і дацкіх лабістаў-кардыналаў (напрыклад, таго ж Сенгаленскага), у дацкіх архівах сярод матэрыялаў караля Ёгана-Ганса і Капенгагенскага ўніверсітэта за 1506–1517 гг., сярод дыпламатычных дакументаў караля Жыгімонта і князя Васіля III, а таксама ў архіўных зборах Венецыянскай рэспублікі. Бо не выключана, што імя Скарыны можа таксама фігураваць у складзе пасольстваў у Масковію, Польшчу і Вялікае Княства Літоўскае, Венецыю.

З 5 да 9 лістапада 1512 г. Францыск Скарына, як сведчаць запісы ў «Актах пра наданне акадэмічных ступеняў» Падуанскага ўніверсітэта, трымаў іспыты на атрыманне ступені доктара медыцыны. 5 лістапада на сходзе «Святой калегіі» пад старшынствам віцэпрыёра ў касцёле св. Урбана яму была дадзеная «ласка», як беднаму трымаць іспыты бясплатна «з любові да Бога», за што аднагалосна прагаласавалі ўсе сябры Калегіі. На другі дзень адбыўся пробны іспыт, на якім дактарант бліскуча адказаў на ўсе прапанаваныя яму пытанні і выдатна адхіліў ўсе довады супраць, а таму «з агульнай згоды быў дапушчаны да асабістага іспыту ў медыцыне». Асабісты іспыт ён трымаў 9 лістапада ў прысутнасці 14 вучоных і «праявіў сябе настолькі пахвальна і вельмі годна падчас гэтага свайго строгага экзамена, цытуючы на памяць зададзеныя яму пытанні і выдатна адхіляючы довады супраць, што атрымаў аднадушнае ўхваленне ўсіх без выключэння прысутных вучоных, і было прызнана, што ён мае дастатковыя веды ў медыцыне». Пасля гэтага Францыск Скарына быў урачыста абвешчаны доктарам медыцыны, а прамотар доктар вольных навук і медыцыны Барталамей Барызон уручыў яму адпаведныя знакі медыцынскай ступені. У той жа дзень таксама быў унесены пратакольны запіс пра гэтую падзею ў кнігу «Diversorum...» Падуанскай біскупскай курыі. Якраз у ім Скарына названы сакратаром караля Даніі [29, p. 226–228; 8, p. 243–346].

На ўсіх мерапрыемствах, звязаных з атрыманнем доктарскай ступені ад медыцыны ў Падуі, прысутнічалі і бралі ўдзел у дыскусіях 32 асобы: дактары і магістры, студэнты, прадстаўнікі духавенства. Сярод прысутных, прынамсі, тры чалавекі маглі мець дачыненне да кнігадрукавання: Барталамей Санвіта (які быў звязаны з венецыянскім друкам), Антоніа дэ Санчына і Хрыстафор а Ліньямінэ [30, p. 24–26].

Пасля 9 лістапада 1512 г. і да 6 жніўня 1517 г. след Скарыны зноў губляецца. Невядома, ці заставаўся ён яшчэ на пасадзе каралеўскага сакратара. У кожным разе перад абаронай у Падуі альбо пасля гэтага ён павінен быў ці ў складзе дыпламатычнай місіі, ці самастойна пабываць у Венецыі. З пэўнасцю можна сцвярджаць толькі, што ў гэты час ён займаўся падрыхтоўкай да кнігадрукавання ў Празе. Дзеля гэтага ён павінен быў заручыцца падтрымкаю айчынных дабрадзеяў, а таксама вырашыць пытанні з тэхнічным забеспячэннем друкарскай дзейнасці ў Празе.

6 жніўня 1517 г. у Празе «Францишек, Скоринин сын с Полоцька, в лекарских науках доктор, повелел ... Псалтырю тиснути». Выдаўшы за два гады апрача «*Псалтыра*» яшчэ 22 кнігі Старога Запавету, Скарына пасля 15 снежня 1519 г.павінен быў вярнуцца на радзіму і ў 1522 г. выдае ў Вільні «*Малую падарожную кніжку*», а затым у 1525 г. – «*Апостала*». Пасля гэтага ягоная выдавецкая дзейнасць была спынена з невядомых прычын. У 1526 г. Скарына прысутнічае ў якасці сведкі ў Вільні пры акце фундацыі касцёла і школы ў вёсцы Весічы Гарадзенскага павета [2, с. 83], а на пачатку 1529 г. фігуруе ў судовым дэкрэце Польскага караля і вялікага князя ВКЛ Жыгімонта наконт маёмасці сваёй жонкі Маргарыты. Жонка Маргарыта, удава Юрыя Адверніка, і не названыя па імені дзеці ўпершыню згадваюцца ў гэтым дэкрэце [2, с. 91].

У тым жа 1529 г. ён ад імя свайго і Маргарыты ўдзельнічаў у Познані ў працэсе пра падзел маёмасці памерлага брата Івана і атрымаў частку маёмасці [2, с. 110–112]. Апрача яго ў падзеле маёмасці як прэтэндэнты бралі ўдзел зяць Івана Еська Стэпановіч, віленскі грамадзянін Яцка Фальковіч, купец і познанскі райца Кляўс Габэрлянд, а таксама жонка Якуба Корбы, у падвале пад домам якога захоўваліся скуры, якімі гандляваў Іван Скарына. Пры даследаванні матэрыялаў архіва Прускай культурнай спадчыны ў Берліне намі былі выяўлены дакументы, што сведчаць пра сувязі двух фігурантаў справы пра падзел маёмасці: Кляўса Габэрлянда і Якуба Корбы з прускім герцагам Альбрэхтам Гагенцолернам. 1 жніўня 1529 г. датуецца ліст герцага да Кляўса Габэрлянда наконт нейкіх рымскіх спраў [31, f. 42v]. У лісце да караля Польшчы і вялікага князя ВКЛ Жыгімонта ад 2 мая 1527 г. герцаг прасіў караля дапамагчы матэрыяльна абрабаванаму купцу Якубу Корбу [32, p. 218–219]. 1 красавіка 1539 г. райцы Познанскай рады звярнуліся да Альбрэхта з просьбаю дапамагчы дзецям-сіротам нябожчыка Якуба Корбы, якіх праследуюць крэдыторы за даўгі бацькі [33, nr. 31]. Пасля разгляду справы пра падзел маёмасці ў Познані, у канцы 1529 альбо ў першай траціне 1530 г., Францыск Скарына, як вынікае з чатырох лістоў Альбрэхта, быў у яго на службе, адкуль ужо ў маі выправіўся назад у Вільню, звёзшы з сабою лекара і друкара герцага. Спачатку Альбрэхт піша да Віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ Альбэрта Гаштольда і да Віленскай рады з просьбаю дапамагчы Скарыне і абараніць яго ў нейкіх сямейных і матэрыяльных справах,

а таксама дае яму ахоўны падарожны ліст [2, с. 95 і наступныя]. Але ў апошнім лісце да Гаштольда герцаг рэзка мяняе тон і просіць паўплываць на Скарыну, каб той вярнуў яму вывезеных падданых [2, с. 102]. Яўген Неміроўскі мяркуе, што гэтымі двума асобамі былі вывезены Альбрэхтам з Кракава юдэі лекар Майсей і яго брат Аляксандр, які займаўся друкарскай справаю. У 1530-х гг. браты зноў аб'явіліся ў Кракаве [34, с. 206].

Як вынікае з аналізу карэспандэнцыі герцага Альбрэхта, апрача Гаштольда ён меў сувязі з асобамі, якія пэўным чынам прычыніліся да лёсу першадрукара: віленскім біскупам Янам, у якога ён служыў сакратаром і які быў стрыечным братам герцага, слуцкім князем Георгіем, які фундаваў касцёл у Весічах, дзе сведкаю быў Скарына [35, 12 oct., 22 nov.], іншымі дастойнікамі ВКЛ і Польшчы. З перапіскі, якую актыўна вёў Альбрэхт з каралеўскім канцлерам Крыштафам Шыдлавецкім, мы даведваемся пра прынесеную з Англіі ў Прусію «потную гарачку», якая за кароткі час забрала тут каля 30 тысяч жыццяў. У верасні 1529 г. захварэў сам герцаг, а таксама яго цяжарная жонка Даратэя, дачка дацкага караля. Толькі ў канцы кастрычніка абаім удалося справіцца з хваробаю [32, p. 417–426, 441–444]. Мабыць, у першую чаргу, для дапамогі ў час пошасці і быў запрошаны ў прускі Каралявец-Кёнігзберг Францыск Скарына. Здарылася гэта, магчыма, пасля звальнення з пасады асабістага герцагскага лекара Вільдэ, які, на думку Альбрэхта, не ўбярог яго і жонку ад хваробы і якому ён шукаў замену [34, с. 200]. У лісце Крыштафа Шыдлавецкага да Альбрэхта ад 7 студзеня 1530 г. змешчана цікавае паведамленне: «За кніжку, напісаную найдасведчанейшым лекарам найяснейшай Вашай міласці, дзякую ласкава і ўдзячны: гэтыя супрацьхваробныя сродкі маю ўжываць не толькі таму, што хачу знішчыць гэты найатрутнейшы вірус, але таксама дзеля таго, што іх прыслаў мне мой пан і брат, які з Божай дапамогаю пазбавіўся ад такой вялікай небяспекі» [36, nr. 171]. Ці не была гэта кніжка (збор рэцэптаў?), напісаная тым доктарам медыцыны, пра якога Альбрэхт пазней пісаў да Гаштольда ў лісце ад 25 кастрычніка 1529 г.: «Не так даўно прыбыў пад нашу ўладу выдатны і шматвопытны муж Францыск Скарына з Полацка, доктар прыгожых мастацтваў і медыцыны, даравіты выкладчык, падданы Вашай высокай міласці і грамадзянін найслаўнейшага горада Вільні. Звярнуўшы ўвагу як на яго сапраўды дзівосны талент, так і найвышэйшае майстэрства, якое ён дэманструе са здзіўляючым бляскам і вопытнасцю, якую набыў, відаць, не інакш як толькі праз сваю шматгадовую працу і падарожжы дзеля пазнання мноства ведаў, мы міласціва прыпісалі яго да ліку і кола нашых падданых і верных мужоў і паставілі яго ў рад тых, да каго прыхільна ставімся» [2, с. 95–96]. Якраз у канцы кастрычніка 1529 г., калі герцаг Альбрэхт і яго жонка ачунялі ад хваробы, скончыўся познанскі працэс пра падзел маёмасці Івана Скарыны, і Францыск мог апынуцца ў Караляўцы неўзабаве пасля звальнення Вільдэ і прадэманстраваць сваё лекарскае мастацтва пры двары Альбрэхта. Пакінуць Прусію Скарыну хутчэй за ўсё змусілі справы ў Вільні, дзе 2 сакавіка 1530 г. здарыўся вялікі пажар, які знішчыў дзве траціны горада. Магла пацярпець і маёмасць першадрукара, вялі яго на радзіму таксама і апасенні за жыццё родных, жонкі і дзяцей [2, с. 95–96].

Праз два гады ў 1532 г. у Познані першадрукар патрапіў у судовы працэс, распачаты варшаўскімі юдэямі супраць яго за даўгі памерлага брата Івана, быў нават кінуты ў вязніцу і прасядзеў у ёй каля чатырох месяцаў. Юдэі прадставілі яго каралю як распарадчыка спадчынаю нябожчыка. Толькі ўмяшанне ў справу іванавага сына, пляменніка Францыска Скарыны, Рамана, прывяло да вырашэння справы на карысць першадрукара і вынясенне выраку супраць пазоўнікаў [2, с. 125 і наступныя]. Апошні дакумент, датычны гэтай справы, – ахоўны ліст, выдадзены каралём Польшчы і вялікім князем ВКЛ Жыгімонтам I Францыску Скарыне, які датуецца 25 лістапада 1532 г. Пасля гэтага мы зноў губляем яго з поля зроку аж да мая 1535 г. Вельмі верагодна, што адразу пасля познанскага працэсу ён перабраўся ў Чэхію. З ім, відаць, прыбыла туды і яго сям'я.

З 22 мая 1535 г. да 21 ліпеня 1539 г. у перапісцы наконт каралеўскага сада ў Празе паміж каралём Фердынандам I і пражскай каморай згадваецца садоўнік Францыск [2, с. 163 і наступныя]. Мяркуючы з пазнейшага, выдадзенага каралём Сымону Русу, сыну памерлага, прывілея ад 1552 г. на адшуканне і валоданне маёмасцю яго бацькі, гэтым садоўнікам быў, як піша кароль, «доктар Францішак Рус Скарына з Полацка, нябожчык, які быў нашым садоўнікам і чужынцам у гэтым каралеўстве Чэшскім, — сышоў на вечны спакой і пакінуў пасля сябе сына Сімяона Руса і пэўную маёмасць, паперы, даўгі і іншае, яму належнае» [2, с. 185]. З гэтага

ліста мы таксама даведваемся імя аднаго з сыноў Скарыны. Другі сын згадваецца ў паведамленні чэшскага аўтара XVI ст. Вацлава Гаека з Лібачан пра пажар у Празе, дзе ў 1541 г. у доме Яна з Пухава загінуў «чаляднік Францішак, які быў сынам доктара Руса» [37]. Ян з Пухава, адміністратар Пражскай дыяцэзіі, руплівы абаронца каталіцкай веры ў Чэхіі, быў адным з самых вядомых і ўплывовых людзей XVI ст. у краіне, з якім, без усялякага сумнення, павінен быў быць добра знаёмы Францыск Скарына і якому ён аддаў на «дзядзькаванне» свайго сына [38, с. 65–73].

Пра другога сына вядома з Рожмбэрскай хронікі Вацлава Бржэзана – аўтара канца XVI – пачатку XVII ст. Пад 1577 г. ён паведамляе: «22 мая ксёндз Іржык Чэтл, архіпрэзбітэр Бехінскага краю і крумлаўскі пробашч, скончыў жыццё ў Крумлаве. Ён карыстаўся паслугамі доктара, нейкага паляка Сімяона па прозвішчы Рус з Полацка. Той пробашч пахаваны 24 мая» [2, с. 187]. Пазнейшае паведамленне гісторыка Францішка Тэплага апавядае пра дзейнасць Сімяона (Шымона Роўсака) у Індржыхавым Градцы ў якасці садоўніка мясцовага пана Ёахіма з Градца. Сімяон, які спаборнічаў у гэтай справе з іншым садоўнікам, перахрышчаным юдэем Якубам, у 1584 г. быў адпраўлены на лячэнне: «...стары садоўнік Рус з Полацка Шымон Роўсак, якога з-за ягонай нядужасці паслаў ягамосць пан у 1584 г. лячыцца ў Добрай Водзе ля Капліцы, даўшы яму 1 капу і 30 грошаў» [2, с. 189].

Нядаўна намі разам з дактарантам Карлавага ўніверсітэта ў Празе Паўлам Котавым быў зроблены запыт у абласны архіў г. Тржэбаня. У выніку пошукаў, праведзеных чэшскімі архівістамі доктарам Ладэнай Плусаровай і магістрам Ганай Жэлэзнай, былі выяўлены два арыгінальныя дакументы з 1584 г., датычныя адпраўкі на лячэнне Сімяона Руса. Адзін з гэтых дакументаў змяшчае ўласнаручны подпіс Сімяона. Улічваючы тое, што ўзгаданыя архівы ад самага свайго заснавання не зазналі страт, можна спадзявацца на новыя знаходкі дакументаў, асвятляючых не толькі біяграфію сына першадрукара, але і яго славутага бацькі Францыска Скарыны. Патрабуюць таксама новых грунтоўных даследаванняў і архівасховішчы тых гарадоў, з якімі звязаны лёс першадрукара і яго сыноў: Кракава, Прагі, Падуі, Познані, Капенгагена, Гданьска, Рыма і Ватыкана, Вільні, Рыгі, Масквы. Навуковыя здабыткі і знаходкі апошніх гадоў даюць надзею на выяўленне новых звестак з біяграфіі нашага земляка, доктара вольных навук і медыцыны, першадрукара і заснавальніка каралеўскага сада ў Празе, сакратара і прыбліжанага высокапастаўленых еўрапейскіх дзеячаў, дыпламата Францыска Скарыны.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Шчакаціхін, М. Калі радзіўся Францішак Скарына / М. Шчакаціхін // Полымя. – 1925. – № 5.

2. Францыск Скарына: зб. дакументаў і матэрыялаў / уклад., прадм., камент., паказ. В. І. Дарашкевіча. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988.

3. Vita clarissimi viri fratris Joannis de Capistrano, feliciter incipit, per fratrem Nicolaum de Fara, socium ejusdem // Acta Sanctorum. Octobris. T. X. Bruxellis, 1861. – P. 466.

4. Kantak, K. Bernardyni Polscy / K. Kantak. – T. 1. 1453–1572. – Lwów, 1933.

5. Fijałek, J. Początki cenzuryprewencyjnej w kościele rzymskokatolickim w Polsce / J. Fijałek //Studia staropolskie. Księga ku czci Aleksandra Brücknera. – Kraków, 1928.

6. Album studiosorum universitatis Cracoviensis. T. II. (Ab anno 1490 ad annum 1551) / Ed. curavit Adam Chmiel. – Cracoviae, 1892.

7. Statuta nec non liber promotorum philosophorum ordinis in universitate studiorum Jagellonicz ab anno 1402 ad annum 1849 / Ed. Iosephus Muczkowski. – Cracoviae, 1849.

8. Ghetti, M. C. Il soggiorno padovano di Francisk Skorina / M. C. Ghetti // Manoscritti, editoria e biblioteche all'età contemporanea. Studi offerti a Domenico Maffei per il suo ottantesimo compleanno / Cur. Mario Acheri, Caetano Colli. – Roma, 2006.

9. Галенчанка, Г. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Галенчанка. – Мінск, 1993.

10. Галенчанка, Г. Праблемныя дакументы Скарыніяны ў кантэксце рэальнай крытыкі / Г. Галенчанка // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў / гал. рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1998. (Беларусіка=Albaruthenica; Кн. 9).

11. Брага, С. Геаграфічная лякалізацыя жыцьцяпісу доктара Скарыны / С. Брага. – Нью-Ёрк, 1965.

12. Shutava, V. Again about Skaryna in Padua: circumstances / V. Shutava // Belarusian review. – Vol. 27, No. 1.

13. Città del Vaticano. Archivio Segreto Vaticano. Fondo Borghese. Serie I. 889, 890; Città del Vaticano. Archivio dell'Ufficio delle Celebrazioni Liturgiche del Sommo Pontefice. Cerimonieri pontifici. 371, 376 A;Città del Vaticano. Biblioteca Apostolica Vaticana. Barb. lat. 2689, 2798;Città del Vaticano. Biblioteca Apostolica Vaticana. Chig. L. I. 19; Città del Vaticano,

Biblioteca Apostolica Vaticana, Urb. lat. 1016; Città del Vaticano, Biblioteca Apostolica Vaticana, Vat. lat. 12268, 12269, 12305, 12412, 12414, 12415.

14. Biblioteca Casenatense in Roma. – Codex, 1594.

15. Датский архив. Материалы по истории Древней России, хранящиеся в Копенгагене. 1360–1690 гг. / сост. Ю. Н. Щербачев. – М., 1893.

16. Regesta diplomatica historiae Danicae. Ser. II. T. 1. – Kjøbenhavn, 1886.

17. Fortegnelse over Danmarks breve fra middelalderen med udtog af de hidtil utrykte. 2. Række / Udg. ved William Christensen. 6. Bind (1505–1510).

18. Kong Hans's Brevbog // Aarsberetninger fra det kongelige geheimearchiv indeholdende bidrag til Dansk historie af utrykte kilder / Ungivne af C. F. Wegener. Bd. 4. – Kjøbenhavn, 1852–1855.

19. Bilag til kong Hans's Brevbog// Aarsberetninger fra det kongelige geheimearchiv indeholdende bidrag til Dansk historie af utrykte kilder / Ungivne af C. F. Wegener. Bd. 4. – Kjøbenhavn, 1852–1855.

20. Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lithuaniae in quo pacta, foedera, tractatus pacis... nunc primum ex archivis publicis eruta ac in lucem protracta exhibuntur. [Ed.] M. Dogiel. T. 1. – Vilnae, 1758.

21. Acta Tomiciana. – T. IV. – Cracoviae, 1855.

22. Regiae academiae Hafniensis infantia et pueritia ... ab Alberto Thura. Elensburgi et Altonaviae, 1734.

23. Epistolae Jacobi quarti, Jacobi quinti et Mariae, regum Scotorum... ab anno 1505 ad annum 1545. Vol. I. – Edinburgi, 1722.

24. Суворов, Н. С. Средневековые университеты / Н. С. Суворов; изд. 2-е. – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2012.

25. Gairdner. Letters and papers illustrative to the reigns of Richard III. and Henry VII. – Vol. II.

26. Nya Källor till Finlads Medeltidsistoria… / Af Edward Grönblad. Förstasamlingen. – Köpenhamn, 1857.

27. Шутова, О. М. Вновь портрет Скорины, или о необходимости «читать» гравюры / О. М. Шутова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. – Вып. 10. – Мінск, 2015.

28. Цітоў, А. Шляхамі Францыска Скарыны / А. Цітоў. – Мінск, 2016.

29. Acta graduum academicorum ab anno 1501 ad annum 1525 / A cura di Elda Martellozzo Forin. – Padova, 1969.

30. Shutava, V. Again about Skaryna in Padua: Attendees / V. Shutava// Belarusiam Review. – Summer 2015. – Vol. 27, No. 2.

31. Берлін, GStAPK. XX. Ostpr. Fol. 42.

32. Берлін, GStAPK. XX. Ostpr. Fol. 48.

33. Берлін, GStAPK. XX. HBA. B 3. Kasten 437 (1525–1547).

34. Немировский, Е. По следам Франциска Скорины: документальная повесть / Е. Немировский. – Минск, 1990.

35. Берлін, GStAPK. XX. HBA. B 2. Kasten 357 (1533, nr. 323–366).

36. Берлін, GStAPK. XX. HBA. B 2. Kasten 360 (1536, nr. 460–509).

37. O nesstiastnee przihodie kteraž gse stala skrze ohen w Menssim Miestie Pražském. – Praha, 1541.

38. Лемешкин, И. В. Франциск Скорина и Прага 1541 г. / И. В. Лемешкин // Palaeoslavica. – 2016. – Vol. XXIV, No. 1.

References

1. Shchakatsikhin M., "When was Frantsisk Skorina born", *Polymia* [Flame], 1925, no. 5.

2. *Frantsysk Skaryna: zb. dakumentau i materyialau* [Frantsisk Skorina: Sat. documents and materials], Science and Technology, Minsk, BY, 1988.

3. "Vita clarissimi viri fratris Joannis de Capistrano, feliciter incipit, per fratrem Nicolaum de Fara, socium ejusdem", *Acta Sanctorum*, Octobris, T. X, Bruxellis, BE, 1861, p. 466.

4. Kantak K., *Bernardyni Polscy*, vol. 1. 1453–1572, Lwów, UA, 1933.

5. Fijałek J.,"Początki cenzury prewencywnej w kościele rzymsko – katolickiem w Polsce", *Studia staropolskie. Księga staropolskie*, Księga ku czci A.Brücknera, Kraków, PL, 1928, pp. 127–144.

6. Chmiel A. (ed.), *Album studiosorum universitatis Cracoviensis. T. II. (Ab anno 1490 ad annum 1551)*, Typis Univ. Jagellonicae, Cracoviae, PL, 1892.

7. MuczkowskiI., *Statuta nec non liber promotorum philosophorum ordinis in universitate studiorum Jagellonicz ab anno 1402 ad annum 1849*, Typis Univ., Cracoviae, PL, 1849.

8. Ghetti M. C.,"Il soggiorno padovano di Francisk Skorina", *Manoscritti, editoria e biblioteche all'età contemporanea. Studi offerti a Domenico Maffei per il suo ottantesimo compleanno*, in Acheri M., ColliC. (ed.), Roma, IT, 2006.

9. Galenchanka G. Ia., *Frantsysk Skaryna – belaruski i uskhodneslavianski pershadrukar* [Frantsisk Skorina – Belarusian and East Slavic first printer], Science and Technology, Minsk, BY, 1993.

10. Galenchanka G., "Problem Skoriniana documents in the context of real criticism", *480 god belaruskaga knigadrukavannia: materyialy Tretsikh Skarynauskikh chytanniau* [480 years of Belarusian book printing: Materials of the third reading Skorinovskie], in Mal'dzis A. (ed.), Belarusian science, Minsk, BY, 1998, (Belarusika = Albarutenika. Kn. 9), pp. 9–20.

11. Braga S., *Geagrafichnaia liakalizatsyia zhyts'tsiapisu doktara Skaryny* [Geographic localization of the live of Doctor Skorina], New York, US, 1965.

12. Shutava V., "Again about Skaryna in Padua: circumstances, Part 2", Belarusian Review, Spring, 2015, vol. 27, no. 1, pp. 23–28.

13. Città del Vaticano. Archivio Segreto Vaticano. Fondo Borghese. Serie I. 889, 890; Città del Vaticano. Archivio dell'Ufficio delle Celebrazioni Liturgiche del Sommo Pontefice. Cerimonieri pontifici. 371, 376 A; Città del Vaticano. Biblioteca Apostolica Vaticana. Barb. lat. 2689, 2798; Città del Vaticano. Biblioteca Apostolica Vaticana. Chig. L. I.19; Città del Vaticano, Biblioteca Apostolica Vaticana, Urb. lat. 1016; Città del Vaticano, Biblioteca Apostolica Vaticana, Vat. lat. 12268, 12269, 12305, 12412, 12414, 12415.

14. Biblioteca Casenatense in Roma, Codex, 1594.

15. Shcherbachev Iu.N., Datskii arkhiv". *Materialy po istorii drevnei Rossii, khraniashchiesia v" Kopengagen. 1326–1690 gg.* [The Danish archive. Materials on the history of ancient Russia, stored in Copenhagen. 1326–1690], University printing house, Moscow, RU, 1893.

16. Regesta diplomatica historiae Danicae, Ser. II,vol. 1, Kjøbenhavn, DK, 1886.

17. Erslev K. S. A., Christensen W., Hude A. S., *Repertorium diplomaticum Regni danici mediaevalis: Fortegnelse over Danmarks breve fra middelalderen, med udtog af de hidtil utrykte*, vol. 4, I kommission hos G. E. C. Gad, Denmark, 1894.

18. *Aarsberetninger fra det Kongelige geheimearchiv – indeholdende bidrag til Dansk historie af utrykte kilder*, Bind 2, I commission hos C. A. Reitzel, Rigsarkivet, Denmark, 1860.

19. *Aarsberetninger fra det Kongelige Geheimearchiv indeholdende Bidrag til Dansk historie af utrykte kilder*, Bind 4, I commission hos C. A. Reitzel, Rigsarkivet, Denmark, 1866.

20. Dogiel M. (ed.), *Codex diplomaticus regni Poloniae et magni ducatus Lituaniae in quo pacta, foedera, tractatus pacis, mutuae amicitiae, subsidiorum, induciarum, commerciorum... nunc primum ex archivis publicis eruta ac in lucem protracta exhibentur*, Typ. Collegii C. C. R. R. Scholarum piarum, Vilnae, RU, vol. 1, 1758.

21. *Acta Tomiciana*, vol. IV, Cracoviae, PL, 1855.

22. Thura A., "Lauridsen Regiae", *Academiae Hafniensis infantia et pueritia sub tenebris pontificiis breviter delineate*, Korte fratres, Flensburgi, DE, MDCCXXXIV (1734), pp. 25–30.

23. Epistolæ Jacobi Quarti, Jacobi Quinti, et Mariæ, regum Scotorum eorumque; tutorum et regni gubernatorum; ad imperatores, reges, pontifices, principes, civitates, et alios, ab anno 1505, ad annum 1545, Ruddiman, Thomas (ed.), James McEuan, George Stewart et John Paton, Edinburgh, GB, 1724.

24. Suvorov N. S., *Srednevekovye universitety* [Medieval Universities], 2nd ed., Book house "LIBROKOM", Moscow, RU, 2012.

25. Gairdner J. (ed.), *Letters and papers illustrative to the reigns of Richard III. and Henry VII*, Longman, Roberts, and Green, London, GB, 1863, vol. II.

26. Grönblad E. (ed.),*Nya källor till Finlands medeltidshistoria*, I. 1335–1524, Denmark, 1857.

27. Shutova O. M., "Again a portrait of Skaryna, or the need to "read" engravings", *Krynitsaznaўstva i spetsyial'nyia gistarychnyia dystsypliny* [A source study and special historical disciplines], vol. 10, pp. 58–80.

28. Tsitoў A. K., *Shliakhami Frantsyska Skaryny* [Ways Frantsiska Skoriny], Public education, Minsk, 2016.

29. Elda Martellozzo Forin (ed.), *Acta Graduum Academicorum ab anno 1501 – ad annum 1525*, Antentore, Padova, IT, 1969.

30. Shutava V., "Again about Skaryna in Padua: Attendees", Belarusian Review, Summer 2015, vol. 27, no. 2,pp. 21–28.

31. Berlin, GStAPK, XX, Ostpr. Fol. 42.

32. Berlin, GStAPK, XX, Ostpr. Fol. 48.

33. Berlin, GStAPK, XX, HBA, B 3. Kasten 437 (1525–1547).

34. Nemirovskii E., *Po sledam Frantsiska Skoriny: dokumental'naia povest'* [In the footsteps of Francis Skaryna: a documentary story], Belarus, Minsk, BY, 1990.

35. Berlin, GStAPK, XX, HBA, B 2. Kasten 357 (1533, nr. 323–366).

36. Berlin, GStAPK, XX, HBA, B 2. Kasten 360 (1536, nr. 460–509).

37. Hajek z Libocan V., *O nesstiastnee przihodie kteraž gse stala skrze ohen w Menssim Miestie Pražském*, Praha, CZ, 1541.

38. Lemeshkin I. V., "Francis Skaryna and Prague in 1541", *Palaeoslavica*, 2016, vol. XXIV, no. 1, pp. 52–78.

Информация об авторе

Жлутка *Александр Анатольевич* – канд. филол. наук, ст. науч. сотрудник. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси» (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: alesius@tut.by.

Information about the author

Zhlutka *Aleksandr Anatolyevich*, Ph. D. (Philol.), Senior Scientific Researcher, Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: alesius@tut.by.

Для цитирования

Жлутка, А. А. Невядомыя старонкі біяграфіі Францыска Скарыны / А. А. Жлутка // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 3. – С. 40–50.

For citation

Zhlutka, A. A. Unknown Pages of Francisk Skorina's Biography / A. A. Zhlutka // Proc. Natl. Acad. Sci. Belarus: Hum. Ser., no. 3, 2017, pp. 40–50.

ISSN 1024-5928 (print)
УДК [070(Наша Ніва+929(092)+94(4745+476)]“1906/1915”

Паступіў у рэдакцыю 28.03.2017
Received 28.03.2017

А. У. Унучак

Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

ЯНКА КУПАЛА І ЯКУБ КОЛАС У «НАШАЙ НІВЕ»

Рассматриваются идейные основы творчества Я. Купалы и Я. Коласа в начале XX века и влияние на них газеты «Наша Нива». Автор пришел к выводу, что главным мотивом творчества обоих литераторов в этот период был показ важности борьбы за свое государство. Высказывается гипотеза, что творческий псевдоним «Янка Купала», который взял себе поэт Иван Луцевич, происходит от имени библейского пророка Иоанна Крестителя, поскольку слово «Креститель» на церковнославянский язык переводится именно как «Купала». Одновременно в Библии Иоанн Креститель видит свою миссию в том, чтобы подготовить свой народ к приходу Мессии Иисуса Христа. В этом смысле творчество Янки Купалы было направлено именно на то, чтобы белорусы как народ поверили в свою уникальную миссию и были готовы к созданию собственного государства. Также рассматривается поэма Якуба Коласа «Новая земля» в которой автор показывает земельную проблему в Беларуси конца XIX – начала XXв. в контексте российско-польской борьбы, предметом которой были белорусские земли.

Ключевые слова: Янка Купала, Якуб Колас, «Наша Нива», белорусское национальное движение, борьба за национальную государственность.

A. U. Unuchak

Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

YANKA KUPALA AND YAKUB KOLAS IN NASHA NIVA

The article explores ideological foundations of Yanka Kupala’s and Yakub Kolas’s literary work in the early 20th century and how they were influenced by Nasha Niva, a newspaper. The author comes to the conclusion that the main motive of the both writers’ literary work in that period was to show the importance of struggling for Belarusian statehood. Also, the author proposes a hypothesis to explain that the pseudonym of Yanka Kupala used by the poet Ivan Lutsevich derives from the name of the Biblical prophet, John the Baptist: the word “Baptist” is translated into Church Slavonic exactly as “Kupala”. Moreover, according to the Bible, John the Baptist sees his mission in preparing his people for the coming of the Messiah, Jesus Christ. Similarly, what Yanka Kupala’s literary work sought was exactly for the Belarusians to believe in their unique mission and be prepared to establish their own independent state. The article also explored Yakub Kolas’s poem, The New Land, that points out the problem of land in Belarus in the late 19th and early 20th centuries in the context of the struggle for the Belarusian lands between Poland and Russia.

Keywords: Yanka Kupala, Yakub Kolas, Nasha Niva, Belarusian national movement, struggle for national statehood.

Імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа цесна звязаны з газетай «Наша Ніва», якая выходзіла ў Вільні ў 1906–1915 гг. Менавіта на палосах «Нашай Нівы» друкаваліся раннія творы абодвух беларускіх песняроў. З рэдакцыяй «першай беларускай газеты з рысункамі» звязана таксама публікацыя першых зборнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Абодва яны працавалі ў рэдакцыі «Нашай Нівы», а Янка Купала ў 1914–1915 гг. быў рэдактарам-выдаўцом газеты.

Мэта артыкула – характарыстыка грамадска-палітычных поглядаў Янкі Купалы і Якуба Коласа ў «нашаніўскі» перыяд іх творчасці.

Варта адзначыць, што Я. Купала і Я. Колас пачалі сваю літаратурную творчасць адпаведна на польскай і рускай мовах. У сваёй аўтабіяграфіі, напісанай па просьбе акадэміка Я. Карскага, Я. Колас пісаў: «Пачаў пісаць я па-расейску. Помню хлопцам 14 ці 13 гадоў напісаў я верш па-расейску “Весна” і прачытаў яго свайму бацьку. Бацька праслухаў уніклівa і сказаў: “Добра”. А калі я зьвярнуў яго увагу на тое, што гэты вершык напісан мною, то ён пацалаваў мяне і даў мне срэбраны рубель» [1, арк. 1адв.].

Зварот да беларускай мовы ў Я. Коласа адбыўся ў час вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Пра гэты час ён сам пісаў наступнае: «У 1898 гаду я вытрымаў экзамін ў Нясьвіжскую настаўніцкую сэмінарыю. У сэмінарыі на мяне меў вялікі ўплыў <…> настаўнік Кудрынскі,

© Унучак А. У., 2017

чалавек жывы, сам літэратар, ён катурхаў нашы думкі, кіраваў імі, закідаў зерне любосьці да прыгожаго пісьменства <…>. Яшчэ да паступленьня ў сэмінарыю пазнаёміўся я з беларускімі творамі Янкі Лучыны, якія пападаліся мне ў рукапісах. Я сам стаў прабаваць пісаць па-беларуску. Адзін вершык выпадкова папаў у рукі Кудрынскаго. Прачытаўшы яго, ён сказаў мне: “Вот ваша настоящая дорога”. З таго часу я пачаў часьцей зварачацца да пісаньня па-беларуску. Многа маіх вершаў, чытаных паміж таварышаў, пагубілася» [1, арк. 2].

Падобным чынам адбылося і ў Я. Купалы, які пісаў пра сваю навуку акадэміку Я. Карскаму наступныя словы: «Дзіцячыя гады я правёў крыху панічыкам, як аканомскі сын. Вучылі мяне спачатку па-польску пры помачы вандроўных вучыцеляў. Па-расейску наўчыўся я ад сваей нянькі. Быў у бацькі календар, у каторым маю ўвагу звярнулі асабліва словы: “Дозволено Цензурою”, гэта мусіць дзеля таго, што першые літэры гэтых слоў не падобны да польскіх. Вучыўся я наагул добра. Палавіну аднэй зімы вучыўся у народн. вучылішчы у Сенніцы не далёка ад Менска. Пасьля крыху у Менску у нейкай прыватнай прыгатоўчай школе. С часам бацька хацеў мяне прыгатаваць у рэальную школу. Прыгатаўляў сын дырэктара Менскай рэальн. школы Вл. Ів. Самойло. Але нічога ня вышла. Паміма таго, што дырэктар мяне прыймаў без экзамену, бацька пастанавіў не аддаваць у школу, а ісьці гаспадарыць» [2, арк. 4].

Па-беларуску Я. Купала пачаў пісаць пасля знаёмства з галоўнымі лідарамі беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. братамі І. і А. Луцкевічамі, якое адбылося ўлетку 1904 г. [3, с. 8–9]. У «Нашай Ніве» ён дэбютаваў 11(24) мая 1907 г. вершам «Касцу», дзе дарэчы ўзгадаў паўстанцкія часы, касінераў. Тут дарэчы нагадаць, што Я. Купала не выпадкова звяртаўся да тэмы паўстання 1863–1864 гг. Як пісаў у свой час даследчык Г. Кісялёў, у юнацкія гады Я. Купала даволі блізка сышоўся з паплечнікам К. Каліноўскага З. Чаховічам [4]. У бібліятэцы З. Чаховіча ў Бесядах Вілейскага павета Віленскай губерні Я. Купала пазнаёміўся з «нелегальнай літаратурай», якая датычылася тэмы паўстання 1863–1864 гг. На аснове вывучэння біяграфій Я. Купалы і З. Чаховіча даследчык выказаў меркаванне, што «з кніг пра паўстанне 1863 года, з расказаў Чаховіча Купала павінны быў даведацца пра жыццёвы подзвіг Каліноўскага, запомніць ягонае імя, а магчыма, і пазнаёміцца з яго творамі (“Лісты з-пад шыбеніцы”, “Мужыцкая праўда”). Фігуральна кажучы, падчас сустрэч і размоў Чаховіча і Купалы па-над імі лунаў цень вялікага Кастуся … публіцыстыка і паэзія Каліноўскага былі надзвычайна блізкія Купалу, які разам са сваімі паплечнікамі па сутнасці працягваў справу Каліноўскага» [4, с. 148].

Адным з сяброў Я. Купалы, якія спрыялі раскрыццю яго літаратурнага таленту, быў У. Самойла – сын дырэктара Мінскага рэальнага вучылішча. 15(28) жніўня 1908 г. ён надрукаваў у «Нашай Ніве» рэцэнзію на першы зборнік вершаў паэта «Жалейка». Маладога Купалу прыкмецілі ў рэдакцыі і ў верасні 1908 г. запрасілі на працу [3, с. 13]. У свой першы перыяд Купала працаваў у «Нашай Ніве» да кастрычніка 1909 г., а ў снежні гэтага года ён паехаў у Пецярбург, дзе, знаходзячыся пад апекай спачатку В. Іваноўскага, а затым прафесара Пецярбургскай духоўнай акадэміі Б. Эпімах-Шыпілы, паступае на агульнаадукацыйныя курсы Чарняева, якія скончыў у 1913 г., не пакідаючы пры гэтым сувязяў з рэдакцыяй, складаючы і прысылаючы ў Вільню свае творы. Там жа, у Пецярбургу, Купала становіцца блізкім супрацоўнікам В. Іваноўскага ў выдавецкім таварыстве «Загляне сонца і ў наша ваконца» [3, с. 200]. У чэрвені 1913 г. ён разам з В. Іваноўскім вярнуўся ў Беларусь і лета разам з вераснем 1913 г. правёў у маёнтку Акопы, а ў кастрычніку стаў сакратаром Беларускага Выдавецкага Таварыства, старшынёй якога быў В. Іваноўскі. Пры гэтым Я. Купала практычна ніколі не пакідаў сувязі з «Нашай Нівай».

Калі адзначыць галоўны матыў грамадска-палітычнай думкі ў літаратурных творах Я. Купалы, то, безумоўна, варта звярнуцца да паняцця «забраны край». Гэтае паняцце сімвалічнае, Я. Купала выкарыстоўваў яго для характарыстыкі становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

У зборніку «Шляхам жыцьця», які пабачыў свет у 1913 г., быў апублікаваны верш Я. Купалы з аднайменнай назвай «Забраны край», які меў падзагаловак «Балканскім славянам». Верш быў напісаны ў 1912 г., і з цэнзурных меркаванняў Я. Купала вымушаны быў «прысвяціць» яго «балканскім славянам», хаця ў творы змяшчаецца шэраг момантаў, якія сведчаць пра тое, што ў першую чаргу верш прысвечаны Беларусі: «*Людзей запытаеш, – адкажуць спакойна: /* “*Забраны край*” *гэты калісь*» [5, с. 208].

Вядома, публікацыя такога верша не магла застацца без увагі расійскай урадавай прэсы. У 1914 г. афіцыйнае выданне «Виленский Вестник» звярнула ўвагу ўрадавых органаў на тое, што рэдактар-выдавец «Нашай Нівы» І. Луцэвіч гаворыць пра беларускія землі як пра «забраны край», што, на думку «Виленского Вестника», несла ў сабе выразны антыўрадавы пасыл. Больш за тое, афіцыйнае расійскае выданне сцвярджала, што нібыта паняцце «забраны край» і сама «Наша Ніва» да Я. Купалы не выкарыстоўвала. Я. Купала вымушаны быў тлумачаць сваю пазіцыю, фактычна апраўдвацца, казаць, што тэрмін «забраны край» ён запазычыў з «Материалов для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края» П. Шэйна, які, праводзячы адпаведнае апытанне сялян Гродзенскай губерні, запісаў іх самавызначэнне: «наша старана ні руска ні польска, але забраны край!» [6, с. 1]. Адсюль можна патлумачыць, што выраз у вышэйзгаданым вершы: «*Людзей запытаеш, – адкажуць спакойна: /* “*Забраны край*” *гэты калісь*» з’яўляецца нічым іншым, як толькі паэтычным пераказам таго, што ўдалося даведацца ў канцы XIX ст. этнографу П. Шэйну пра самасвядомасць беларусаў. Такім чынам, Я. Купала даводзіў, што гэты тэрмін не яго прыдумка, не рэдакцыйная фраза, а што менавіта так ацэньваюць сваё становішча беларусы ў складзе Расійскай імперыі.

Цікава, што нападкі расійскай афіцыёзнай і заходнярускай прэсы на «Нашу Ніву» былі звязаны не толькі са зместам купалаўскага артыкула «А ўсё ж такі мы жывём!...», але і з эпіграфам да яго «*Не пагаснуць зоркі ў небі, / Покі небо будзе, Не загіне край забраны, / Покі будуць людзі…*» [6, с. 1].

Артыкул Я. Купала напісаў пра тое, што «польскія і расейскія нацыяналісты» вялі бесперапыннае змаганне з беларускім рухам, імкнучыся даказаць самім сабе і іншым, што беларусаў як нацыі не існуе. Але гэта справа, паводле Я. Купалы, была марнай, бо сваёй мэты ні рускія, ні палякі дасягнуць ужо не здольныя. Беларускае адраджэнне паказала і даказала сваю жыццёвасць і паспяховасць: «У некалькі год мы зрабілі тое, што ў палякаў і расейцаў рабілася чуць ня цэлымі сталецьцямі» [6, с. 1].

Чаму ўзнік такі вялікі розгалас вакол тэрміна «забраны край»? У першую чаргу таму, што ён быў занадта сур’ёзным намёкам на ліквідацыю Вялікага Княства Літоўскага ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай канца XVIII ст. Калі беларусы негатыўна ацэньвалі тыя падзеі, значыць, павінны былі свой край «вяртаць» назад.

Такім чынам, Я. Купала выкарыстоўваў азначэнне «забраны край», каб паказаць сутнасць становішча беларускіх зямель у Расійскай імперыі. Купала пісаў у адным з ранніх вершаў у 1905 г.: «*Мяне ўзялі ў салдаты ў чужацкі палон*» [5, с. 31]. У вершы «Што ты спіш?» (1906) Купала ставіць праблему становішча «забранага краю» вельмі востра: «*А не грошы твае // Там у банку ляжаць? // Не за грошы ж твае // Цар ідзе ваяваць? / Не за грошы ж твае // Цэркаў гэта стаіць? // Не за грошы ж твае // Яна срэбрам блішчыць?*» [5, с. 36]. Тут паказваецца не толькі кепскае матэрыяльнае становішча краю, пра што пісаў яшчэ К. Каліноўскі ў «Мужыцкай праўдзе», але і даецца характарыстыка канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі на беларускіх землях.

Вяртаючыся трохі назад, нельга не ўзгадаць верш «Прарок», апублікаваны ў апошнім нумары «Нашай Нівы» за 1912 г. Размова ішла пра прарока, які паўстаў з народа, каб заступіцца за яго перад моцнымі суседзямі, пад якімі выразна разумеліся Расія і Польшча: «*Аж так дасціг – аквечан хвалай / Зямлі забранай***,** *сумных хат / Дзе царства цемры панавала / Дзе сілу ўзяў над катам кат*» [7, с. 2]. У гэтым вершы, напісаным у Пецярбургу ў снежні 1912 г., алегарычна апісваецца гісторыя беларусаў, народа, які добраахвотна апусціўся да нацыянальнага рабства, забыў нават сваё імя. Таму місія прарока не проста клікаць-абуджаць нацыю, але і заступацца за яе перад Богам: «*За мной, за мной, забраны людзе! / Я добрай доляй послан к вам; / І знаю, што было, што будзе, / І вас у крыўду не аддам*» [7, с. 2].

На нашу думку, гэты верш і выраз «забраны край» здольны прыадкрыць сэнс псеўданіма Івана Луцэвіча. На пачатку 1907 г. у адказ на навагодняе віншаванне Я. Купалы У. Самойла прысвяціў апошняму цэлы верш на рускай мове, у якім ёсць такія радкі: «*Так было, будет в каждом веке: / Поэт хранит святую нить, / Чтоб всё, что Божье в человеке / В борьбе кровавой сохранить*» [8, с. 52].

У сярэдзіне 1920-х гг. у Мінску выйшаў з друку «Беларуска-расійскі слоўнік», складзены М. Байковым і С. Некрашэвічам. У гэтым слоўніку слова «Купала» перакладаецца на рускую мову, як «1) бог белорусской мифологии; 2) Иван Креститель» [9, с. 154]. Калі звярнуцца да этыма-

логіі слова «Купала», то можна заўважыць, што гэта літаральны пераклад слова «Хрысціцель» з грэчаскай мовы, якое азначае: «той, хто акунае ў ваду для ачышчэння» [9, с. 528]. У многіх славянскіх народаў імя Ян Хрысціцель перакладалася, як Іван Купала [9, с. 528]. Таму, на нашу думку, можна сцвярджаць, што псеўданім беларускага песняра звязаны менавіта з біблейным прарокам, а не з Купаллем, з хрысціянскімі, а не з язычніцкімі традыцыямі. Пра гэта сведчыць яго творчасць.

Звернем увагу на гістарычнага Яна Хрысціцеля. Біблія сведчыць, што на самым пачатку нашай эры ізраільскі народ знаходзіўся пад рымскай акупацыяй і прагнуў вызвалення. Рымская культура, мова, звычаі, рэлігія – усё было чужым і непрымальным для яўрэяў, якія марылі пра незалежнасць і сваю дзяржаву, сваё царства. Да гэтага дадаваліся месіянскія чаканні. Месія, па-грэчаску Хрыстос, павінен быў прыйсці і вызваліць Ізраіль. Менавіта ў гэты час на гістарычную арэну выходзіць Ян Хрысціцель, які аб'яўляецца на заходнім беразе ракі Іардан і прапаведуе хуткі прыход Месіі і ўсталяванне Царства Божага. Ірад Анціпа, тагачасны тэтрарх у Палесціне, быў надзвычай здзіўлены поспехамі маладога прапаведніка. Ён быў напалоханы той вялікай хваляй пакаянняў-хрышчэнняў, якія адбываліся на Іардане і загадаў зняволіць Яна Хрысціцеля ў крэпасці Махерон [10, с. 468]. І хоць Яна чакала пакутніцкая смерць, ён выканаў сваю місію – падрыхтаваў народ да прыходу Хрыста, Які і ўсталяваў Царства Божае. Ян Хрысціцель быў прарокам народным, ён прапаведаваў усяму народу, людзям усіх прафесій, саслоўяў і званняў. Ён не меў афіцыйнай пасады, але меў вялізны ўплыў на грамадства і пры гэтым адкрыта заяўляў, што ён не Месія [11]. Сам пра сябе Ян казаў, што ён «голас таго, хто кліча ў пустыні» [11].

Усе гэтыя характарыстыкі мы з поўным правам можам прымяніць і да Я. Купалы, да яго бачання сваёй ролі ў беларускім адраджэнні. Верш «Забраны край» проста грыміць голасам біблейнага прарока: «*Сляпы знемагацца бацька ў цямніцы; / На стражы пастаўлен сынок; / У поўных калісьці ад шчасця святліцах / Чужак зневажае дачок / Дзяцей сваіх маткі кідаюць у здзеку, / За "мамак" к наездзцам ідуць, / А тыя за іх малако, за апеку /"Забраны край" болей гнятуць*» [5, с. 208].

У 1910 г. у радках, прысвечаных рэдакцыі «Нашай Нівы», пясняр пісаў: «*Пад навалай крыўдаў, многіе сталецьця / Мы нясьлі пакорна лямку безпрасьвецьця. / Мы нясьлі - ўсё ныла, гінула памалу, / аж не нашай наша бацькаўшчына стала*» [12, с. 141].

Тэма «забранага краю» шчыльна звязана з нацыянальна-вызваленчымі паўстаннямі XIX ст. Я. Купала ў сваім першым вершы ў «Нашай Ніве» пад назвай «Касцу» пісаў якраз пра касінераў – «народную сілу» паўстання: «*Быў даўней народ хітрэй, // Не знаў стрэльбаў, дык аей! // Коскі шаблямі былі, // Ваяваць з імі ішлі*» [5, с. 60]. Цікавае таксама заканчэнне гэтага верша: «*Ці даждуся калі кос і песень касцоў / На другой, на вялікай касьбе?...*» [12, с. 121]. Тут Я. Купала задаваў сабе і свайму чытачу пытанне: ці будзе ўсеагульны ўздым на барацьбу са сваю дзяржаву, за сваю свабоду? Пастаноўка гэтага пытання была лагічнай, калі прыгадаць, што Луцэвічы – беларуская шляхта, што на Я. Купалу вялікі ўплыў зрабіў паўстанец 1863 г. З. Чаховіч.

Што тычыцца творчай спадчыны Я. Коласа, то ў пачатку свайго супрацоўніцтва з газетамі «Наша Доля» і «Наша Ніва» ён напісаў шэраг вершаў, прысвечаных рэвалюцыйным падзеям 1905–1907 гг. Пасыл гэтых вершаў у тым, што людзі самі адказныя за свой лёс. Як прыклад можна прывесці радкі з верша «Беларусам»: «*Ці ж мы, хлопцы, рук ня маем? // Ці ж нам сілы Бог ня даў? // Ці ж над родным нашым краем // Промень волі не блішчаў?*» [13, с.149].

Галоўным паняццем для разумення творчасці Я. Коласа з'яўляецца выраз «новая зямля». У сваёй аднайменнай паэме класік беларускай літаратуры ставіў пытанне пра тое, што найбольшай праблемай у жыцці краю быў недахоп зямлі ў тых, хто на ёй працаваў.

На першы погляд даволі дзіўна гучаць радкі Коласа пра плач аб зямлі, якую сяляне, асабліва ў Беларусі (улічваючы аграрную палітыку М. Мураўёва), усё ж могуць набываць. Але, калі ўлічыць кантэкст расійска-польскага культурнага змагання на беларусікх землях, якое надзвычай абвастрылася з моманту паўстання 1863–1864 гг., то «плач аб зямлі» становіцца больш зразумелым. Надзел зямлі можна набыць (тут яшчэ асобная гаворка пра каталікоў, якім па сутнасці было забаронена набываць зямлю), але краіна не была сваёй, парадкі ў краі не былі сваімі. Сам Я. Колас паходзіў з Мікалаеўшчыны, каталіцкага паселішча, якое ў 1866 г. гвалтоўна перавялі ў праваслаўе, яшчэ дзед Я. Коласа быў каталіком [14, с. 120]. Таму вокліч галоўнага героя паэмы «Новая зямля»

Міхала: *«Чаму й ня я між ягамосцяў»* можна разумець таксама і ў кантэксце арганічнай працы і расійска-польскага змагання. Уласнасць – гэта свая цывілізацыя. Гэта жыццёвая апора. Аднак уласнасць у краі мелі па сутнасці толькі рускія і палякі.

Згодна з ідэалогіяй арганічнай працы, якую распрацавала грамадства краю пасля паражэння паўстання 1863–1864 гг., купля і ўтрыманне зямлі былі патрыятычным абавязкам. І таму Міхал, з якім «сам князь Антоні (Радзівіл. – *А. У.*) не раз вёў размову», імкнуўся атрымаць асабістую свабоду, якую гарантуе ўласнасць. З гэтага пункта погляду, Міхалам кіруе не мужыцкі індывідуалізм, а патрыятычны персаналізм – «свая зямля – вось, што аснова», ці «хоць шляхціц цёмны, як саган, // затое сам ён сабе пан» [15, с. 124].

Гэта ж можна сказаць пра «дзядзьку ў Вільні», тут ёсць два матывы: першы – што селяніну чужы горад, як такі; а другі – што яму, як і Ф. Багушэвічу, варожы «забраны горад». Да таго ж, у канцы XIX ст., калі разгортваюцца падзеі «Новай зямлі», у Беларусі існуе сістэма «антыпольскага» заканадаўства і складанасць куплі зямлі праз банк мела таксама нацыянальнае вымярэнне.

Такім чынам, і Я. Купала, і Я. Колас у «нашаніўскі» перыяд сваёй творчасці распрацоўвалі тэму асэнсавання становішча Беларусі пад уладай Расійскай імперыі. Калі Я. Купала імкнуўся паказаць, што край «забраны» і за яго трэба змагацца, каб адрадзіць былую веліч і здабыць сваю дзяржаву, то Я. Колас паказваў моцнае імкненне беларусаў да «новай зямлі», па сутнасці да сваёй зямлі, сваёй дзяржавы. Вядома, што найбольшы ўплыў на станаўленне і Я. Купалы і Я. Коласа зрабілі члены рэдакцыі газеты «Наша Ніва», а таксама ўсё «нашаніўскае кола», як тады называлі прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Тут варта назваць імёны братоў І. і А. Луцкевічаў, В. Іваноўскага, А. Уласава, Ядвігіна Ш., В. Ластоўскага і інш. На сённяшні момант ідэйная спадчына галоўных беларускіх літаратурных класікаў патрабуе новага пераасэнсавання і 135-гадовы юбілей з часу іх нараджэння, які адзначаецца ў гэтым годзе, з'яўляецца добрай для гэтага нагодай.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Санкт-Пецярбургскі філіял Архіва Расійскай акадэміі навук. – Ф. 292. Воп. 2. – Спр. 62.

2. Санкт-Пецярбургскі філіял Архіва Расійскай акадэміі навук. – Ф. 292. Воп. 2. – Спр. 700.

3. Сідарэвіч, А. Луцкевічы і Луцэвіч / А. Сідарэвіч. – Мінск: Грамадскае аб'яднаньне «Фонд імя братоў Луцкевічаў», 2003. – 14 с.

4. Киселев, Г. Бесядские пути-дороги / Г. Кіселев // Неман. – 1984. – № 3. – С. 142–148.

5. Купала, Я. Выбраныя творы / Я. Купала. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2002. – 604 с.

6. За "А ўсё-ж такі мы жывём" // Наша Ніва. – 1914. – 20 чэрвеня. Факсімільнае выданне. – Вып. 5. – Мінск: Тэхналогія, 2010.

7. Купала, Я. Прарок / Я. Купала // Наша Ніва. – 1912. – 21 снежня. Факсімільнае выданне. – Вып. 5. – Мінск: Тэхналогія, 2010.

8. Пуцявінамі Янкі Купалы: Дакументы і матэрыялы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 312 с.

9. Православная Энциклопедия / под ред. Патриарха Московского и всея Руси Кирилла. – Т. XXIV. – М.: Церковно-научный центр «Православная энциклопедия», 2010. – 751 с.

10. Мень, А. История религии: В поисках Пути, Истины и Жизни : в 7 т. – Т. 6 / А. Мень. – М.: СП «Слово», 1993. – 622 с.

11. Новы Запавет і Кніга Прыповесьцяў. – Мінск: Пазітыў-цэнтр, 2016. – 511 с.

12. Купала, Я. Шляхам жыцьця / Я. Купала. – Пецярбург, 1913. – 264 с.

13. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Т. 1: Вершы (1898–1910). – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 622 с. – С. 149.

14. З жыццяпісу Якуба Коласа: дакументы і матэрыялы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 383 с.

15. Колас, Я. Новая зямля: паэма / Я. Колас. – Мінск: БФК, 2002. – 904 с.

References

1. *Sankt-Petsiarburgski filiial Arkhiva Rasiiskai akademii navuk* [St. Petersburg branch of the Russian Academy of Sciences Archive], F. 292b Vop. 2, Spr. 62.

2. *Sankt-Petsiarburgski filiial Arkhiva Rasiiskai akademii navuk* [St. Petersburg branch of the Russian Academy of Sciences Archive], F. 292, Vop. 2, Spr. 700.

3. Sidarevich A., *Lutskevichy i Lutsevich* [Lutskevich and Lutsevich], Gramadskae ab'iadnan'ne «Fond imia bratoў Lutskevichaў», Minsk, BY, 2003.

4. Kiselev G., "Besyad Roads-roads", *Neman* [Neman], 1984, no. 3, pp. 142–148.

5. Kupala Ia., *Vybranyia tvory* [Selected works], Belaruski knigazbor, Minsk, BY, 2002.
6. “For "And yet we live in"”, *Nasha Niva*, 1914, June 20th, facsimile edition, vol. 5, Tekhnalogiia, Minsk, BY, 2010.
7. Kupala Ia., “Prophet”, Nasha Niva, 1912, December 21, facsimile edition, vol. 5, Tekhnalogiia, Minsk, BY, 2010.
8. *Putsiavinami Ianki Kupaly: Dakumenty i materyialy* [Yanka Kupala ways: Documents and Materials], Navuka i tekhnika, Minsk, BY, 1981.
9. Patriarkh Moskovskii i vseia Rusi Kirill (ed.), *Pravoslavnaia Entsiklopediia* [Orthodox Encyclopedia], vol. XXIV, Tserkovno-nauchnyi tsentr «Pravoslavnaia entsiklopediia», Moscow, RU, 2010.
10. Men' A., *Istoriia religii: V poiskakh Puti, Istiny i Zhizni: v 7 t., T. 6* [History of religion: In search of the Way, Truth and Life: in 7 volumes, Volume 6], SP «Slovo», Moscow, RU, 1993.
11. *Novy Zapavet i Kniga Prypoves'tsiau* [The New Testament and the Book of Proverbs], Pazityu-tsentr, Minsk, BY, 2016.
12. Kupala Ia., *Shliakham zhyts'tsia* [Way of life], Petersburg, RU, 1913.
13. Kolas, Ia. *Zbor tvorau*: *u 20 t., T. 1: Vershy (1898–1910)* [Works in 20 t, Volume 1: Poems (1898–1910)], Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2007.
14. *Z zhytstsiapisu Iakuba Kolasa: dakumenty i materyialy* [From the biography of Yakub Kolas: documents and materials], Navuka i tekhnika, Minsk, BY, 1982.
15. Kolas Ja., *Novaja zjamlja: paema* [New Land: Poem], BFK, Minsk, BY, 2002.

Информация об авторе

Унучек *Андрей Владимирович* – канд. ист. наук, зав. отделом. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси» (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: unuchak@gmail.com.

Information about the author

Unuchak *Andrei Uladzimiravich*, Ph. D. (Hist.), Head of Department, Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: unuchak@gmail.com.

Для цитирования

Унучак, А. У. Янка Купала і Якуб Колас у «Нашай Ніве» / А. У. Унучак // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 3. – С. 51–56.

For citation

Unuchak, A. U. Yanka Kupala and Yakub Kolas in Nasha Niva / A. U. Unuchak // Proc. Natl. Acad. Sci. Belarus: Hum. Ser., no. 3, 2017, pp. 51–56.

ISSN 1024-5928 (print)

МОВАЗНАЎСТВА

LINGUISTICS

УДК 811.161.3’373

Паступіў у рэдакцыю 28.02.2017
Received 28.02.2017

А. М. Булыка

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь

РОЛЯ Ф. СКАРЫНЫ Ў РАЗВІЦЦІ СЛОЎНІКАВАГА СКЛАДУ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНА-ПІСЬМОВАЙ МОВЫ

Статья посвящена определению роли Ф. Скорины в развитии словарного состава старобелорусского литературно-письменного языка. В ней исследуются наличные в пражских библейских изданиях белорусского первопечатника лексические средства праславянского, древнерусского, церковнославянского, западнославянского и западноевропейского происхождения с точки зрения их влияния на старобелорусский словарь. Наиболее подробно освящена собственно белорусская словообразовательная система. Основное внимание обращено на лексические единицы, которые можно считать продуктом словообразовательной деятельности белорусского первопечатника.

Ключевые слова: лексика, лексикон, словообразование, префиксация, суффиксация, заимствование, полонизм, чехизм.

A. N. Bulyko

Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

FRANCISK SKORINA'S ROLE IN DEVELOPING THE VOCABULARY OF THE OLD BELARUSIAN LITERARY AND WRITTEN LANGUAGE

The article is devoted to determining Francisk Skaryna’s role in developing the vocabulary of the Old Belarusian literary and written language. It examines the Bible editions issued by the first Belarusian book printer in Prague for lexical units of the Proto-Slavic, Old Russian, Church Slavonic, West Slavic, and West European origin and determines their impact on the Old Belarusian lexicon. The proper Belarusian word-formation system receives the most detailed account. The main focus is made on the lexical units which can be considered a product of the first Belarusian printer’s word-formation activity.

Keywords: lexical units, lexicon, word formation, prefixation, suffixation, borrowing, Polonism, Czechism.

Перакладчыцкая дзейнасць беларускага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны працякала ва ўмовах моцнага ўздзеяння з боку роднай, царкоўнаславянскай і чэшскай моўных стыхій. Таму натуральна, што слоўнікавы склад яго выданняў у многім вызначаецца арыгінальнасцю і непаўторнасцю на фоне старабеларускай і наогул усходнеславянскай пісьменнасці таго часу і што менавіта спрадвечна беларуская, царкоўнаславянская і заходнеславянская лексіка фарміруюць генетычную аснову скарынаўскага слоўніка.

Пры разглядзе спрадвечнай лексікі як адной з асноўных састаўных частак слоўніка Скарыны неабходна перш за ўсё адзначыць, што ў яе выкарыстанні беларускі першадрукар у большасці выпадкаў працягваў даўнія пісьмовыя традыцыі. Як і ў мове помнікаў старабеларускай пісьменнасці XIV – пачатку XVI ст., у яго лексіконе прысутнічаюць намінацыйныя сродкі, зберажоныя жывой народнай гаворкай ад дапісьмовай эпохі, лексічныя адзінкі, утвораныя ў перыяд функцыянавання старажытнарускай літаратурна-пісьмовай мовы, а таксама інавацыі ўласнабеларускага ўтварэння.

Сярод слоў праславянскага паходжання, якія асабліва шырока выкарыстаў беларускі першадрукар пры перакладзе міфаў аб стварэнні свету, шматлікіх бытавых і батальных сцэн з жыцця старажытных народаў, самы буйны і семантычна разнастайны разрад утвараюць назоўнікі. У пераважнай ступені яны звязаны тэматычна з характарыстыкай навакольнай рэчаіснасці, служачы для абазначэння рэалій зямной паверхні (*вода, гора, долина, лесъ, озеро, поле, река, ставъ, холмъ, яма*),

© Булыка А. М., 2017

раслін і пладоў (*бобъ, груша, дубъ, жито, ленъ, орехъ, слива, трава, чеснокъ, ягода*), прадстаўнікоў жывёльнага свету (*волкъ, дятелъ, жаба, конь, лось, медведь, овца, пчела, сова, ястребъ*), органаў і частак цела чалавека і жывёл (*бедро, горло, зубъ, колено, нога, око, палецъ, ребро, ухо, хвостъ*), атмасферных з'яў і працэсаў (*буря, ветръ, градъ, громъ, дождь, иней, ледъ, роса, снегъ, туча*), пор года, пэўных адрэзкаў часу (*весна, вечеръ, година, годъ, день, зима, лето, неделя, ночь, утро*), агульных паняццяў светабудовы, перспектывы і напрамкаў (*верхъ, глубина, долъ, западъ, зоря, небо, низъ, светъ, северъ, солнце*).

Параўнальна вялікая колькасць праславянскіх назоўнікаў, зафіксаваных у тэкстах скарынаўскіх выданняў, характарызуе розныя бакі чалавечай дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. Паводле тэматычнай арыентацыі яны размяркоўваюцца па некалькіх лексіка-семантычных групах. Кампактныя групоўкі ўтвараюць, у прыватнасці, словы, звязаныя з бытавой і гаспадарчай сферамі, выступаючы ў якасці назваў будынкаў рознага прызначэння і іх частак (*гумно, двери, домъ, клеть, лествица, окно, печь, стена, стреха, хлевъ*), прадметаў бытавога ўжытку (*ведро, коритo, котелъ, миса, ножъ, поясъ, решето, свеча, столъ, чаша*), прылад працы, транспартных сродкаў і збруі (*возъ, дуга, коса, пила, плугъ, секира, серпъ, соха, узда, шило*), прадуктаў харчавання (*вино, каша, квасъ, крупа, масло, медъ, мука, сыръ, хлебъ, юха*), карысных выкапняў (*глина, железо, медь, мелъ, олово, руда, свинецъ, соль, сребро, уголь*), іншых рэалій з галіны матэрыяльнай культуры і быту. Актыўная роля належыць словам, якія характарызуюць эканамічную і гандлёвую сферу (*вено, дань, даръ, долгъ, доходъ, застава, купля, лихва, торгъ, цена*), асвятляюць грамадскія адносіны (*война, дружба, жалоба, законъ, миръ, обычай, право, приязнь, сваръ, судъ*), знаёмяць з дыферэнцыяцыяй асоб у залежнасці ад полу і ўзросту, ступені сваяцтва (*братъ, внукъ, дедъ, жена, зять, мати, мужъ, отецъ, сестра, сынъ*).

Для асвятлення духоўнага жыцця Скарына прыцягваў многія праславянскія назоўнікі адцягненага значэння. Сярод іх на пярэдні план выступаюць у скарынаўскіх тэкстах лексічныя сродкі, якія даюць уяўленне аб эмацыянальным стане чалавека (*гневъ, жаль, любовь, обида, печаль, радость, страхъ, студъ, тоска, ужасъ*), выражаюць паняцці з галіны этыкі (*блудъ, зло, кривда, ласка, лесть, ложь, позоръ, правда, хула, честь*), сведчаць аб светапоглядзе людзей (*бесъ, богъ, вера, господь, грехъ, духъ, душа, пекло, постъ, рай*), з'яўляюцца назвамі іншых абстрактных паняццяў (*беда, блескъ, воля, диво, краса, напасть, покой, сила, сонъ, шумъ*).

Другі па колькасці значных адзінак разрад праславянскіх слоў складаюць у скарынаўскіх выданнях дзеясловы, шырокае выкарыстанне якіх дазволіла беларускаму першадрукару даць усебаковае апісанне разнастайных падзей, здарэнняў і працэсаў, звязаных з жыццём чалавека і прыродай. Найбольш істотная частка гэтых лексічных сродкаў уяўляе сабой абазначэнні фізічных дзеянняў: *бити, вязати, гасити, давити, жати, ковати, копати, ловити, молоти, молотити, орати, резати, сеяти, стлати, сыпати, тесати, топтати, черпати, чистити, тупати* і інш. Даволі развітыя лексіка-семантычныя групы ўтвараюць таксама дзеясловы, якія абазначаюць рух і перамяшчэнне ў прасторы (*бегати, возити, ездити, летати, носити, падати, плавати, скакати, ступати, ходити*), стан, дзеянне як працэс пераходу з аднаго стану ў другі (*болети, висети, гнити, горети, кипети, расти, светити, спати, тлети, худети),* адчуванні, эмацыянальныя праяўленні (*веселити, гневати, грозити, любити, пети, плакати, рыдати, тешити, тужити, хотети*), мысленне, маўленне (*беседовати, говорити, кликати, кричати, молвити, молчати, мыслити, помнити, пытати, шептати*), іншыя дзеянні і працэсы (*блудити, верити, воевати, держати, ести, звинети, играти, мочи, служити, чинити*) і г. д. У асноўным гэта невытворныя дзеясловы, не ўскладненыя словаўтваральнымі фармантамі, у чым і заключаецца іх адрозненне ад дзеяслоўных лексічных сродкаў, што ўзніклі пазней у асобных славянскіх мовах.

Не менш важную частку слоў праславянскага паходжання складаюць у скарынаўскіх выданнях прыметнікі, якія абазначаюць колеры, масці, адценні (*белый, гнедый, зеленый, пестрый, румяный, рыжий, светлый, синий, темный, черный*), фізічныя ўласцівасці і адчуванні людзей і жывёл (*босый, глухий, голодный, дужий, косматый, лысый, немый, слепый, хромый, худый*), уласцівасці рэчаў (*гладкий, горкий, густый, кривый, мокрый, мяккий, острый, сухий, твердый, теплый*). Параўнальна многа ў Скарыны праславянскіх прыметнікаў, якія характарызуюць памер, вагу, прасторавыя і часавыя прыметы (*быстрый, великий, высокий, глубокий, давный, легкий, тесный, тонкий, тяжкий, широкий*), якасці характару і разумовых здольнасцей (*веселый, гордый, добрый, злый,*

тора Г. Земпера, российских исследователей дизайна И. А. Чернийчук, М. Т. Майстровской; в изучении принципов организации музеев и структуры их коллекций; во введении в научный оборот новых документальных, историографических и изобразительных материалов по истории формирования музеев стран мира и предметному насыщению их коллекций. Наступает эра частных музеев и музеев могущественных транснациональных компаний, таких как «BMW» и «Mersedes-Bence». В изучении этих вопросов существует много проблем методологического плана: как готовить студентов; какой материал изучать по курсу «Архитектоника»; с какими архитектурными объектами знакомить; каким образом распределять учебный материал и на чем его показывать; как готовить материал пояснительной записки в дипломном проекте, если речь идет о музейной или выставочной экспозиции. Удачных проектов в международной практике не так много, по оценкам интернета, их не более *десяти.* Постараемся показать только несколько из них, чтобы прояснить некоторые эстетические, экономические предпосылки их проектирования. В Беларуси пока выпущена одна книга – справочное издание «Музеи Беларуси» [1]. Кроме того, свою лепту внесли белорусские исследователи В. П. Грицкевич и А. А. Гужаловский, а также российский исследователь теории и практики музейного дела Л. М. Шляхтина [2]. Статья может быть полезной и студентам исторического факультета, изучающим предмет «Основы музееведения».

Цель статьи – проанализировать исторические предпосылки реформирования художественно-промышленного образования и музейного дела в Беларуси в конце XX – первом десятилетии XXI в.; осветить вопросы проектирования средовых объектов в контексте изучения дисциплин теоретического цикла; показать, как изменилась общая тенденция изучения дисциплин теоретического цикла в Белорусской государственной академии искусств и в Витебском государственном университете им. П. М. Машерова.

Общее количество выпускников этих вузов составляет не более *пятидесяти человек на всю республику*. Число дизайнеров, работающих в сфере музейного оформления, очень незначительно. В основном привлекаются специалисты из России. *Мы теряем приоритет*. Раньше обходились своими силами и справлялись успешно. *Необходимо возрождать целую отрасль проектирования.* На некоторых примерах постараемся показать, что происходит процесс активизации усилий в области поиска новых пластических форм и технологий в дизайне. То, что было невозможно 20–30 лет назад, оценивается как новаторство и крупный шаг вперед в экспозиционном дизайне и градостроительной практике. Гипотетически часть студентов тем или иным образом будет задействована в практике музейного строительства.

Пластический облик музея резко изменился за последние 15 лет. Музей сегодня внешне похож на взлетающего аиста гигантских размеров (суперпроект). Появились современные технологии экспонирования и проектирования, создаются здания музеев как сложной машины с солярными установками и парусами для отвода солнечной энергии (Д. Либескинд). Это *первая тенденция*. Музей стал предметом вложения денег транснациональных компаний, как было отмечено выше. У нас такая практика наблюдается в росте вневедомственных промышленных музеев, которые находятся в каждом большом развитом областном и республиканском центре. Есть, например, Музей истории железнодорожного транспорта в Бресте – один из самых известных в республике. Это *вторая тенденция.* Музей сегодня – такое же вложение денег, как и банковское дело, что в свою очередь вызывает раздражение у некоторых радикально мыслящих молодых людей, которые не понимают, что музей формирует национальное самосознание и дух. Обратимся к анализу научных изданий последних лет.

Мнения российских ученых и экспертов в средствах массовой информации. Появление в России докторской диссертации и монографии И. А. Чернийчук «Тотальный дизайн. Исследование возникновения и развития», статей в периодике и кандидатских диссертаций по музейному делу дает повод говорить о новой ступени изучения вопроса о феномене современного музея. Исследование И. А. Чернийчук в 2010 г. – это попытка автора поставить все на свои места [3].

В ВГУ им. П. М. Машерова в 2011 г. были введены в научный оборот такие дисциплины, как «История дизайна», «Архитектоника», «Теория и методология дизайна» по системе moodle. Эта образовательная технология создает определенный перевес в методике по сравнению с нашими коллегами в Минске, где практически еще только готовятся перейти на эту систему. На наш взгляд, можно согласиться с мнением И. А. Чернийчук, которая, оценивая технологии в образовании, дает развернутую

картину в преобразовании таких дисциплин, как «Архитектоника» и «История дизайна». Мне как автору статьи пришлось заниматься формированием пакета образовательных программ по этим дисциплинам с 2006 г., т. е. с момента открытия отделения «Дизайн предметно-пространственной среды и дизайн интерьера» [4]. Процесс реорганизации проектирования идет очень быстро. За пару лет студент должен овладеть всеми навыками проектирования. Основа – это знание программ 3D MAX и BLANDER. Факультеты дизайна в Минске и Витебске перешли на эту методику почти полностью. В Институте современных знаний им. А. М. Широкова в Минске тотальное проектирование средовых объектов начинается с 3-го курса и, по утверждению заведующего кафедрой дизайна А. Е. Дягилева, вполне отвечает главной модели образования – привить навыки высокой графической культуры.

В своей диссертации И. А. Чернийчук, в частности, указывает, что «кроме традиционных видов индустриального и графического дизайна со временем дизайном стало называться даже то, *что традиционно считалось искусством или ремеслом»* [3]. Автор дает определение дизайна и отмечает, что он медленно и неуклонно как феномен культуры поглотил все другие формы искусства, превращая здание музея в удивительный архитектурный объект, наделенный новым содержанием в формотворчестве, что значительно отодвинуло наше представление о музее как о здании с колоннами и портиком. Его проектированием сегодня занимаются ведущие практики мирового дизайна, такие как сэр Норман Фостер, Фрэнк Гери, Д. Либескинд и ряд других ярких представителей постмодернизма. Внешне музей уже вообще не похож на классическое здание, и его видовая структура выходит за рамки нашего представления о его внешнем классическом виде (рис. 1): «По силе воздействия и охвата тотальное проектирование стремится встать в один ряд с возможностями Творца, предполагает поглотить архитектуру, скульптуру, живопись и графику, все визуальные виды искусства. Как тенденция развития тотальный дизайн занимает все больше места в жизни людей, превращая жизнь в зрелище, в спектакль, о чем предупреждал еще в 1967 г. французский писатель и философ Ги Дебор» [5]. Фактически вне зависимости от контекста дизайн является своеобразным явлением профессии нового свойства. Замечательный американский художник Энди Уорхолл своим творчеством наглядно доказал это в проекте «Фабрика». Он поставил искусство на поток, превратив его в массовое явление, а его мастерская превратилась в уникальный Музей поп-арта.

Развитие музейного экспозиционного дизайна в контексте реформирования национального художественно-промышленного образования. Развитие музейного экспозиционного дизайна как специфического явления выявляет новую сторону деятельности по трансформации предметно-пространственной среды. В западных странах в связи с развитием общего уровня образования в целом музей имеет широкое пропагандистское значение в обществе. В Англии и Германии широкое распространение получили ***музеи техники.*** Английское слово designer в США уже заменило все то, что раньше считалось сферой искусства. Появились профессии фотографа-дизайнера, мультимедиа-дизайнера, архитектора-дизайнера и многих других. На данную профессию прежде всего повлияли радикальные изменения в обществе, сознании людей, и само ремесло как вид деятельности стало символом этой уникальной синтетической профессии. В поисках непростого ответа на вопрос: «Что такое дизайн?» ко всему сказанному важно добавить следующее: английское слово «design» имеет еще одно значение. Это не только «замысел», но и «умысел», т. е. некая «интрига», что предполагает непрямые пути достижения цели и, значит, не обходится без определенной доли хитроумия» [3, с. 13]. Применительно к нашей теме это объясняет и поиски нового пластического языка. Проект музея компании «BMW» в Штутгарте немецкого архитектора и яркого представителя идей деконструктивизма В. Прикса привлекает наше внимание не новыми формами, а именно воздействием на эмоции зрителя сразу, как только он видит это здание, расположенное рядом с автобаном (рис. 2).



Рис. 1. Здание музея. Новая архитектоника эпохи постмодерна (Д. Либескинд)

Fig. 1. Building of a museum. New postmodern architectonics (D. Libeskind)



Рис. 2. Экспоцентр и Музей компании «BMW» в г. Мюнхене, Германия (В. Прикс)

Fig. 2. BMW Welt in Munich, Germany (W. Prix)

Фотография объекта была впервые напечатана в журнале «ID» в № 4 за 2008 год. Это «взвинченный» вихрь стальных конструкций, турбулентный поток, остановленный на долю секунды самим архитектором и, что очень важно, выполненный столь виртуозно строителями, что является неотъемлемой частью постиндустриального западного ландшафта. Кроме того, в интерьере помимо самих автомобилей расположен и детский музей. Статья о В. Приксе начинается с очень обстоятельного интервью одного из старейших наших историков дизайна В. Глазычева и рассказывает о том, что 30 лет назад В. Прикс в Германии ничем не выделялся, многие считали, что его проекты никогда не выйдут за пределы его архитектурной мастерской. Время доказало обратное. *Музеи техники – это поступь индустриального дизайна. Это основная тенденция развития дизайна во всем мире.* Мы вступаем в новую эру. Нас тоже настораживает эта тенденция. И то обстоятельство, что именно в Беларуси к 500-летию со дня рождения Франциска Скорины в 1990 г. в Полоцке был открыт «Музей белорусского книгопечатания», говорит о многом. *Это феномен нашей национальной культуры*. Мы приглашаем к диалогу крупнейшие музеи мира, о чем свидетельствует последняя выставка «Королевские сокровища. 1600–1800. Из фондов музея Виктории и Альберта», которая состоялась в экспозиции Национального художественного музея Республики Беларусь.

В ВГУ им. П. М. Машерова есть кафедра «Дизайн», где осуществляется подготовка дипломированных специалистов в области проектирования музеев. Эта традиция имеет свои истоки: «В основе системы организации европейского художественно-промышленного образования лежали принципы новой концепции обучения художественному ремеслу, впервые выдвинутые в 1850-х гг. в теоретических трудах Г. Земпера. Именно эти принципы постепенно оформились в стройную и четкую программу организации художественного образования на основе создания *учебно-музейного комплекса*, состоящего из двух компонентов: художественно-промышленного музея и школы для подготовки художников-прикладников по специально разработанной программе, которая основывается на изучении памятников материальной и художественной культуры, входящих в коллекцию музея» [7].

Музеи техники и дизайнерское образование в совокупности входят в сферу тотального проектирования, что является перманентным процессом, очень сложным по своей структуре. Его нельзя разорвать. Примером является *Музей истории Строгоновского высшего художественно-промышленного училища* в Москве. Там сосредоточены все дипломные проекты вуза. Музей огромен и служит базой для обучения будущих дизайнеров.

У першым нумары газеты «Наша доля» на беларускай мове з'явіўся верш Я. Коласа «Наш родны край». Беларуская мова была той стыхіяй, у якой пачынаючы паэт жыў штодня і штохвіліны, яна не ўспрымалася як нешта незвычайнае, узвышанае, мастацкае, а хутчэй – як нешта вельмі звыклае, зямное, прыдатнае для штодзённага выкарыстання. У далейшым Колас час ад часу звяртаўся да рускай мовы, калі пісаў некаторыя свае творы найбольш гумарыстычнага зместу. Функцыі беларускай і рускай мовы ў сталага Коласа як бы памяняліся сваімі месцамі: матчына мова была натуральным спосабам самавыяўлення, несла ў сабе гістарычна-псіхалагічны змест нацыянальна-непаўторнага існавання ў вялікім свеце, а руская мова асацыіравалася з сучаснай паэту мовай рускага народа і мовай міжнародных зносін у Савецкім Саюзе. У лісце С. Шувалаву ад 06.11.1927 г. Я. Колас адзначаў: «Я ганаруся званнем правадзейнага члена Таварыства аматараў расійскай славеснасці, мне такой блізкай і роднай духоўна, бо я на ёй выхоўваўся» [4].

Ва ўяўленні Я. Коласа паэзія асацыіруецца з мастацкай літаратурай наогул як прыгожым пісьменствам. Праўда, у пачатку гэта мастацкасць бачылася ў «піетызмах», якія шчодра папаўняюць многія вершы рускіх паэтаў: «грустная лира», «святые звуки», «святое вдохновенье», «святое время» і г. д. – прыклады ўзяты толькі з аднаго верша, прысвечанага В. Жукоўскаму, літаратурнаму настаўніку Пушкіна. У сферы лірычных перажыванняў ён быў відавочна несамастойным. Крыху пазней Колас лёгка расстанецца з гэтым псеўдапаэтычным слоўнікам, аднак захапленне музычнасцю верша застанецца на ўсё жыццё, так ці інакш выяўляючыся ў яго паэтычных спробах. «Паэт, – згадваў Колас у лісце да Л. М. Клейнбарта, – уяўляўся мне нейкім паўбогам, звышчалавекам. Ён часта займаў мае думкі і летуценні. Само слова «паэт», калі мне даводзілася сустракаць яго, чытаючы кнігі, рабіла на мяне моцнае ўражанне. Я ўзіраўся ў вобраз самога слова. Яно неяк вылучалася з шэрагу іншых слоў, набывала вялікі сэнс і значэнне ў маіх вачах» [4].

Спачатку Колас падпісваў свае рускія вершы ініцыяламі і ўласным прозвішчам. Пазней з'явіліся: «К. Беларус», «Аўтар беларус К. М. Міцкевіч», «Беларус К. М. Міцкевіч». Такое падкрэсліванне сваёй нацыянальнай прыналежнасці невыпадковае. Пазней Колас успамінаў: «Моцнае ўражанне на мяне зрабіла чытанне выкладчыкам літаратуры Ф. А. Кудрынскім, які цікавіўся этнаграфіяй Беларусі, твораў "Лес шуміць" У. Караленкі, "Судны дзень" і "Сляпы музыка"» [5]. Сярод этнаграфічных запісаў, якія вёў у сшытку пад уплывам настаўніка, ён ведаў мноства гісторый і анекдотаў з вясковага жыцця і «шмат аддаваў часу творчасці», аднойчы падклаў і ўласныя вершы на беларускай мове. Настаўнік Ф. А. Кудрынскі заўважыў: «Вось ваша сапраўднае прызванне». Пазней, пазнаёміўшыся з рэдактарам газеты «Наша Доля» А. Уласавым, у якім быў надрукаваны яго верш «Наш родны край», падпісаны ім – Якуб Колас, тлумачыў: «Пісаць мне па-беларуску шмат лягчэй і прасцей, бо сваё роднае, матчына слова мацней закранае струны сэрца» [5].

Нацыянальная рэчаіснасць разгортвала перад Я. Коласам свае велізарныя магчымасці ў ходзе гістарычных змен. Ад сваіх «настаўнікаў», якія «уваходзяць у душу і ўжо не расстаюцца з табою» (словы вымаўляў па-руску і на стары лад (паводле ўспамінаў М. Лужаніна): «учители»). Ад іх ён узяў словы «мера», «аршын», якімі можна было сапраўды вымераць тое, што бачыў навокал. Вядома, размова ішла пра мастацкі метад рэалізму, асноўнымі рысамі якога сталі дэмакратызм, гуманізм, народнасць, праўдзівасць. Аднак уплыў метаду выяўляўся паступова, паэтапна, ад аднаго ўзроўню да другога, больш высокага. У яго вершах не адразу выяўляла пра сябе паняцце «сацыяльнае», як і чыста «мастацкае», часцей – «рэчыўнае», «духоўнае», «нізкае» і «высокае». Перавагу адкрытай публіцыстыцы перад мовай паэтычных метафар і фальклорных паралелізмаў Я. Колас аддаваў у час разваг над уласным лёсам арыштанта і напісаў «астрожны цыкл»: «Сябрам-выгнаннікам», «Сябрам», «Дзе вы?», «Сціхнуў шум на калідоры...», «Смерць арыштанта», «Катаржнікі», «На астрожны лад», «З боку ад жыцця», «Турэмная камера» і інш. Свой смутак выказваў у рытарычных пытаннях: «Ці вы сіраты ў сям'і людской, Што глядзяць на вас Вокам ворагаў? Ці разбоем вы Даставалі хлеб, Што караюць вас Горш за злодзеяў? Або ў вас няма Сілы, розуму, Што прытулкі вам Пазачынены? Ці то сэрцы ў вас Цвярдзей каменя, Што ад вас браты Адракаюцца?» І адказ на пытанні: «Не! Душа у вас, Сэрцы – Добрыя, Думкі чыстыя, Мыслі ясныя!.. Быў у вас хаўрус Крэпка звязаны, Дружбай моцнаю Падпяразаны. Жыў ён думкамі і надзеямі Смела ў бой ісці З ліхадзеямі». Колас верыць, што галоўная бітва наперадзе, а таму заклікаў: «Эх, сябры-браты! Самі знаеце: Агню палкага Іскры маеце. Не тушэце ж вы Той агонь святы, Асвятляйце ім Родны край, куты...» [6].

Літаратурная творчасць – з'ява шматпланавая, неадназначная, там творчыя ўплывы адбываюцца на самых розных узроўнях. З асаблівай сілай яны выяўляюцца ў перыяд, калі адбываецца станаўленне творчай індывідуальнасці, калі пісьменнік з мноства напрамкаў і плыняў робіць пэўны выбар, які найбольш адпавядае ўнутраным патрэбам яго ўласнай творчасці, што адлюстроўваюць, у сваю чаргу, гістарычную неабходнасць і аб'ектыўны стан нацыянальнай літаратуры. Таленту Коласа, шматграннаму па сваёй прыродзе, чым далей, тым больш цесна было ў межах грамадзянскай і пейзажнай лірыкі. Ён адчуваў сябе вольна і раскавана ў эпічных жанрах, якія давалі магчымасць выявіць жыццё шырока і поўна, з энцыклапедычнай усёабдымнасцю.

У астрозе Я. Колас міжволі трываў свой стан залежнасці ад знявагі, але ў той жа час рабіў усё магчымае, каб ратаваць сваіх «сяброў-выгнаннікаў» ад страты свабоды і волі. Ён надзіва шчыра і адкрыта выяўляў сваю цікаўнасць да жанравых сцэнак, бытавых замалёвак, вершаваных жартаў, мясцовых гісторый, аповесцей у вершах для дзяцей... Гэта апавяданні вершам «Зяць», «Паслушная жонка», «Доктар дапамог», «За дождж», «Першы заработак», «Як Янка забагацеў», «На рэчцы зімою» і інш. – ён як бы знарок дэманстраваў сваё уменне гаварыць вершам, ператвараць усё ў свеце, нават самую бытавую падзею, у верш. Будучую паэму-эпас «Новая зямля» ён пачынае з вуснага вершаванага апісання «Як дзядзька ездзіў у Вільню і што ён там бачыў». Пачынае працу над паэмай «Сымон-музыка», якую ў першай рэдакцыі назваў «Казка жыцця». Для школьнікаў складае падручнік «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», дзе былі ўключаны і ўласныя творы. Рыхтаваў для дзяцей «Казкі жыцця», сярод іх «Тры браты», «Жывая вада», «На балоце», «Адзінокае дрэва», «На чужым грунце», «Камень», «Хмарка» і інш.

Шматстайнасць творчых інтарэсаў, аб'яднаная адзінствам адносін да свету, – вось што ўражвае ў Я. Коласа. Шырокі дыяпазон ідэй, жанраў, мастацкіх прыёмаў, аднолькавая свабода самавыяўлення ў лірыцы і эпіцы, у драме і літаратурнай крытыцы, у творах для дарослых і дзяцей не супярэчаць цэласнасці ўспрымання коласаўскай творчасці, у аснове якой ляжыць прынцып гарманічнай арганізацыі мастацкага свету. Можна браць любы фрагмент з самых розных твораў Коласа, як паэтычных, так і празаічных, і пераконвацца ў іх стылявой блізкасці і агульнасці. Колас умее быць самім сабой, апавядаючы пра самыя розныя сферы нацыянальнага існавання. Асабліва выразна прынцып жыццёвай шматстайнасці і філасофскага адзінства выяўляецца ў эпічных творах пісьменніка. Колас чулы да ўнутранай гармоніі свету, умела пераадольвае жыццёвыя антыноміі, глыбока ўжываецца ў сацыяльную і нацыянальную рэчаіснасць, чароўна ператвараючы ўсё навокал сябе ў сапраўдны цуд мастацтва. Але ён не Пратэй, а хутчэй Антэй, які сілкуецца творчай энергіяй зямлі, дзе жывуць яго героі. Ён не можа быць абсалютна свабодным, як, напрыклад, яго рускі кумір А. Пушкін, бо несвабодны, сацыяльна, нацыянальна, духоўна яго народ.

Уласнае жыццё Я. Колас параўноўваў з чаргаваннем пякельных кругоў: «Не раўнуючы, як у «Бажэсцвенай камедыі» [7]. Пасля вызвалення з астрога, «кругоў ада», у яго ўзнікла шмат жыццёвых праблем, якія сустракаюць «выкінутага з жыцця чалавека»: на працу не бяруць, падтрымкі няма, былыя сябры часам пазбягаюць сустрэч, баючыся трапіць пад падазрэнне ў недабрадзейнасці. Міжволі Колас не затрымліваўся на адным месцы: пажыўшы ў Смольні, у родных, некалькі месяцаў жыў у мястэчку Лунінец Пінскага павета, дзе займаецца заняткамі з платнымі вучнямі, з цяжкасцю атрымлівае пасведчанне аб палітычнай дабрадзейнасці. У пачатку жніўня 1912 г. будучы ў гасцях у Смольні, сустракаецца з Янкам Купалам, які прыехаў знарок, каб пабачыцца. Колас успамінаў: «Наша сустрэча насіла сяброўскі, шчыры характар, як быццам мы даўно былі знаёмыя. Я на ўсё жыццё запомніў вобраз Янкі Купалы... Гэта быў вясёлы, жыццярадасны, схільны да дабрадушных жартаў і гумару чалавек... Расталіся мы з ім шчырымі сябрамі, і гэта наша сяброўства захавалася на ўсё жыццё» [8].

У верасні 1912 г. Колас быў афіцыйна прызначаны настаўнікам Пінскага прыходскага вучылішча. Працаваў там да ліпеня 1914 г. У чэрвені 1913 г. ажаніўся з настаўніцай Пінскай чыгуначнай школы Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, з якой перапісваўся яшчэ будучы ў астрозе. У прадмесці Вільні наведалі яе родных, заходзіў у рэдакцыю «Нашай Нівы». В. Ластоўскі напісаў рэцэнзію на яго зборнік апавяданняў «Родныя з'явы»: «Тарас Гушча (псеўданім Коласа) не сказаў свайго апошняга слова; яго талент з кожным годам набірае большага напружання і большай развітасці ў вясёлкавых пералівах гумару і ў зіхаценню чыстых слёз, каторымі перасыпае гумар. Трэба спадзявацца, што імя Т. Гушчы з часам будзе вядома далёка па-за межамі нашымі; услаўляючы імя беларускае яно пойдзе далёка па свету...».

Ужо ў першых празаічных эцюдах і замалёўках («Слабода», «Думкі ў дарозе», «Выбар старшыні», «Сацыяліст») прысутнасць пісьменніцкай асобы адчуваецца ў новым, незнаёмым тагачаснай беларускай літаратуры маштабе вымярэння нацыянальнай рэчаіснасці. Я. Колас свядома выкарыстоўваў жанр народнага анекдота або лірычнай імпрэсіі, каб звярнуць увагу «вялікага свету» на сваіх «няўзрачных» герояў і іх «нецікавае» жыццё. І гэта не часовае захапленне, а свядомая творчая пазіцыя, як неўзабаве выкажацца адкрыта ў глыбока прадуманых апавяданнях, такіх, як «Соцкі падвёў», «Нёманаў дар», «Бунт», «Васіль Чурыла», «У старых дубах», «Тоўстае палена», «Малады дубок». Так сцвярджаўся коласаўскі драматызм, народнасць і гуманізм. Не такі ён «маленькі», герой апавяданняў Коласа, калі здольны пасмяяцца з дурнога царскага паліцыянта або не пабаяўся паставіць у смешнае становішча самога паліцэйскага прыстава. Коласа з яго дэмакратызмам вабіць харство прастаты, псіхалагічная праўда, мера ва ўсім.

Народнасць, беларускасць Коласа выяўляецца нават у сінтаксісе, якому ўласцівы імклівы рух пераважна кароткіх, асабліва не абцяжараных даданымі сказамі і ўдакладненнямі, перыядаў: «З краю лесу стаяла хатка лесніка Васіля Чурылы. Маленькае акенца хаткі смутным значком пазірала ў поле. Здалёк яно здавалася воўчым вокам. Над самым акенцам звісла голая вярбіна і глуха шумела, усё роўна, як стагнала». Гэта асаблівасць стылю бачна не толькі ў пейзажных замалёўках, але і ў перадачы дзеяння: «Цяпер грамада раскідалася на кучкі. Кожная кучка мела свайго прамоўцу. Адны гаварылі так, другія іначай. Сяляне раздзяліліся на дзве часткі». Коласа

захапляла гэта відовішча народнага мора, што адкрывалася перад духоўным зрокам. Чалавечая драма найчасцей у яго адбываецца на людзях, перад вачыма дзясяткаў і соцень аднавяскоўцаў. Так пісьменнік успрымаў паняцце народнасці. Вось чаму ў яго не было праблемы з выбарам, якому стылю аддаць перавагу. У беларусаў ёсць свае казкі, песні, балады, легенды, звычкі, свая мова.

У пачатку Першай сусветнай вайны Якуба Коласа прызвалі на вайсковую службу, але неўзабаве настаўнікаў адпусцілі на працу ў школах. Быў у эвакуацыі пад Масквой. Служыў у пяхотным запасным батальёне ў Маскве, скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча ў званні прапаршчыка, камандаваў ротай. Накіроўваўся на Румынскі фронт, але па дарозе захварэў на ліхаманку і запаленне лёгкіх. Апынуўся на лячэнні ў горадзе Абаянь, дзе ў гэты час жыла яго сям'я. Працаваў настаўнікам у вёсцы Малыя Крукі, непадалёк ад горада. Хадзіў туды пешшу, падчас паходаў падхапіў «іспанку». Зімой 1918–1919 гг. яго, беспартыйнага, але граматнага і «спачуваючага» выбралі сакратаром партыйнай ячэйкі. З лютага 1920 г. працаваў у Абаяні раз'язным школьным інспектарам. Толькі ў маі 1921 г. пры садзеянні беларускага Камісарыята асветы вярнуўся на Радзіму.

Акалічнасці жыцця мала спрыялі творчай працы Я. Коласа. Спачатку пісаў раздзелы з «Сымона-музыкі», апублікаваным у 1918 г. у Мінску. У гэты ж перыяд захапіўся працай над паэмай «Новая зямля». У адрозненне ад нігілістычных адносін да скарбаў сусветнага мастацтва, Колас заняў выразную пазіцыю да класікі, бо разумеў, што менавіта ў эпоху духоўных катаклізмаў узрастае значэнне набыткаў чалавецтва ў сферы культуры.

Грандыёзныя коласаўскія эпічныя задумы, якія ўзнікалі яшчэ тады, калі Колас знаходзіўся ў астрозе, ажыццяўляліся ў час рэвалюцыйнай буры і ваенных падзей. Адзначаная пісьменнікам ідэйная, змястоўная, жанравая, стылявая блізкасць выяўлялася не толькі вонкава, але і ў шматлікіх унутраных пераклічках, прыкметных, калі супастаўляць і асэнсоўваць шэдэўры нацыянальнай літаратуры, саму эпоху іх узнікнення. У Коласа заўсёды жыло імкненне да ўсёабдымнасці ў паказе нацыянальнага космасу, жаданне ў адным вялікім творы выказацца да астатку.

На станаўленне савецкай літаратуразнаўчай школы вялікі ўплыў мелі пралеткультаўскія ўстаноўкі на стварэнне «новай», «пралетарска-сялянскай літаратуры», якая адмаўляла класічную спадчыну, а значыць, усякія супастаўленні павінны былі сведчыць аб светапоглядной перавазе савецкай літаратуры. Такім чынам скажаўся сэнс параўнальна-гістарычнага метаду, адбывалася яго вульгарызацыя і сацыялагізацыя. Літаратурная класіка не магла выяўляць «агульначалавечыя матывы». Аднак і «сялянская літаратура», створаная выхадцамі з вёскі, не здольна была выканаць гэту задачу па той жа прычыне «непралетарскага» паходжання аўтараў. Варта адзначыць асобна, што савецкая крытыка з самага пачатку ўсё ж згадвала імёны класікаў сусветнай літаратуры, пераважна рускай. Асабліва шмат пісалася пра Ф. Дастаеўскага, стагоддзе з дня нараджэння якога тады шырока адзначалася (нешта падобнае пазней адбывалася ў час святкавання юбілеяў Л. Талстога, А. Пушкіна і інш.).

Маладой савецкай крытыцы даводзілася вырашаць вельмі складаныя праблемы літаратурных вытокаў сучасных мастацкіх з'яў, ідэйнай пераемнасці, сувязі літаратуры з філасофіяй, гісторыяй, іншымі відамі навукі і мастацтва. Супастаўленне з класікай, калі яно здаралася, прыкметна ўздымала ўзровень размовы і падводзіла да каштоўных назіранняў. Так, М. Байкоў у артыкуле «Новая беларуская паэма», прысвечаным «Новай зямлі» Я. Коласа, параўноўвае гэты твор з паэтычным эпасам славутых папярэднікаў, створаным А. Пушкіным і А. Міцкевічам. «Як "Яўгеній Анегін", – пісаў крытык, – азначае сабою пачатак росквіту творчай сілы велікарускага народа і з'яўляецца першым манументальным творам расійскай паэзіі, а "Пана Тадэвуша" з поўным правам можна назваць першай і разам з тым адзінай эпапеяй у польскай літаратуры, творам выдатнейшага паэтычнага мастацтва, у якім знайшлі для сябе праяву здольнасці польскага народа, так і паэма Якуба Коласа; адбіваючы ў поўнай меры росквіт сіл і здольнасцей беларускага народа, адчыняе сабой новую, так сказаць, добу ў развіцці беларускай літаратуры, – добу апрацоўкі манументальных твораў беларускай паэзіі» [9].

Па сутнасці, М. Байкоў у сваім грунтоўным крытычным аналізе паэмы Коласа вызначыў яе сапраўдныя мастацкія маштабы, а, супаставіўшы з паэмамі Пушкіна і Міцкевіча, міжволі паказаў, на якім гістарычным этапе знаходзілася беларуская літаратура і якія эстэтычныя задачы яна вырашае. Назваўшы «Новую зямлю» «нацыянальнай беларускай паэмай» і «класічным творам беларускага прыгожага пісьменства» М. Байкоў тым самым адразу дакладна акрэсліў пункт погляду, з якога толькі і магчыма было ацаніць мастацкае значэнне гэтага твора, а заадно і абазначыць

адну з магчымых перспектыў, адкрытых Коласам: «Цяпер ад яго манументальнага эпічнага твора шлях развіцця беларускай паэзіі ідзе да закончанага беларускага рамана» [9]. Прагноз, зроблены крытыкам, неўзабаве быў падтрыманы вывадамі А. Бабарэкі, які назваў паэму Коласа «аўтабіяграфічным вершаваным раманам», праўда, не ўтрымаўшыся пры гэтым, услед за Байковым, ад «класавай ацэнкі» твора як «сялянскага» [10]. Аднак гэта характарыстыка выглядала досыць нявіннай на фоне рашучага непрыняцця твора з боку такіх ваяўнічых змагароў за «новае мастацтва», як крытык Л. Жыцень, які ўбачыў у паэме ідэалізацыю хутара, пропаведзь уласніцтва і назваў яе творам «не нашых і не будучых часоў». Да гонару тагачаснай крытыкі, гэтыя палітычныя абвінавачванні ў адрас паэмы Коласа не атрымалі падтрымкі.

Прафесійная беларуская крытыка, як сведчыць, напрыклад, артыкул І. Замоціна «Пуціны беларускай літаратуры (Якуб Колас. “Новая зямля”)», акрамя ўважлівага прачытання мастацкіх твораў, закранала і навукова-тэарэтычныя прабемы гісторыі, метадалогіі, футуралогіі. І. Замоцін, Я. Барычэўскі, А. Вазнясенскі, выхаванцы рускай культурна-гістарычнай школы, досыць хутка асвоіўшы беларускія літаратурныя рэаліі, імкнуліся ўлічваць эстэтычную прыроду літаратуры, а надзвычай распаўсюджаны ў 1920-я гады сацыялагічны метад ужывалі з поўнай асцярогай. Спрабуючы вызначыць шляхі развіцця беларускай літаратуры, І. Замоцін грунтаваўся найперш на творчым вопыце саміх беларускіх пісьменнікаў, але ўлічваў таксама і мастацкія набыткі сусветнай літаратуры. Так, на аснове аналізу коласаўскай «Новай зямлі» ён зрабіў абгрунтаваны вывад аб унутранай сувязі беларускай літаратуры, культуры і мовы з візантыйскай цывілізацыяй, з міфалогіяй і фальклорам іншых еўрапейскіх народаў («у паэме... адчуваецца месцамі амаль што эпічны спакой Калевалы»), з паэтычным эпасам Г. Лангфела «Песня аб Гаяваце», з дэмакратычнай музай М. Някрасава, іншымі словамі, вывучаў канкрэтны літаратурны факт у сусветным кантэксце, хоць і не надаваў гэтаму асаблівага значэння.

Паэму Коласа І. Замоцін убачыў у святле асноўных задач, якія стаялі перад літаратурай новай Беларусі: «мастацкі рэалізаваць нацыянальнае беларускае самавызначэнне»; «быць фактарам культурнага адраджэння»; «у мастацкіх вобразах адбіць асноўныя моманты жыцця краіны»; «узбагаціць літаратурную мову і разам з тым – правесці ў свядомасць народных мас ідэалы новай сацыяльнасці». Менавіта такі маштаб вымярэння дазволіў Замоціну зразумець, што паэма «Новая зямля» па сваім змесце і форме выходзіць за межы «літаратурнага народніцтва, прадстаўленага ў расійскай літаратуры, напрыклад, Кальцовым, Нікіціным і іншымі паэтамі». Ён убачыў перад сабою «своеасаблівую амальгаму старога, амаль народнага эпічнага складу з навейшымі дасягненнямі мастацка-рэальнага стылю, пераходзячага іншы раз у стыль сімвалізму». А завяршаючы аналіз паэмы ён пераканаўся, што і гэтыя ацэнкі недакладныя: «...перада мною – не твор літаратурнага народніцтва, не перайманне старажытнай эпікі і не сімвалічная мадэрнізацыя народна-паэтычнага слова... перада мною іменна беларуская мастацкая літаратура, якая выявіла ў паэме Якуба Коласа свой сапраўдны арыгінальны твар». Тут відавочная палеміка І. Замоціна з М. Байковым і Л. Жыценем, з сацыялагічнай школай, якую тыя прадстаўлялі ў крытыцы. Аўтар артыкула ўпэўнены, што паэма Коласа знойдзе водгук не толькі ў велікарусаў і ўкраінцаў, але і ў заходняга чытача «сваім яркім мясцовым, этнаграфічным каларытам і чалавецка-значным асвятленнем народна-пралетарскага быту» [11]. Даследчык не абышоўся без «класавых» крытэрыяў ацэнкі твора.

Метадалогія параўнальнага літаратуразнаўства ў Беларусі, нягледзячы на частыя паралелі з літаратурнымі з’явамі жыцця іншых народаў і эпох, складвалася, аднак, вельмі запаволена. Па-першае, не было выразнай задачы на стварэнне падобнай метадалогіі, бо тагачаснае літаратуразнаўства і крытыка ўяўляла сабой досыць эклектычнае спалучэнне розных, часта супярэчлівых навуковых ідэй і эстэтычных тэорый, а працэс тэарэтычнага самаўсведамлення толькі пачынаўся. Па-другое, адсутнічалі пэўныя навукова-тэарэтычныя крытэрыі, паводле якіх павінна было ажыццяўляцца параўнальна-гістарычнае даследаванне, у выніку многія цікавыя самі па сабе літаратурныя аналогіі ўспрымаліся як неабгрунтаваныя.

Адна справа, калі, напрыклад, А. Бабарэка ў артыкуле «“Сымон-музыка” Якуба Коласа» параўноўваў твор з паэмай І. В. Гётэ «Фауст»: ён меў на ўвазе блізкасць сюжэта, бо ў абодвух выпадках гаварылася пра пошукі ісціны людзьмі навукі і мастацтва. Развагі крытыка, відавочна, мелі пад сабою цвёрды грунт для магчымых супастаўленняў. Асабліва цікавыя ў артыкуле

назіранні над фальклорнымі каранямі «Фауста» і «Сымона-музыкі»: калі Гётэ творча выкарыстоўваў народную нямецкую легенду пра доктара Фауста, праўдашукальніка і чарнакніжніка, то Колас абапіраўся на змест беларускай казкі «Музыка і чэрці», запісанай у свой час А. Сержпутоўскім [9]. Сам Колас высока ацэньваў крытычную праніклівасць узвышаўскага крытыка і яго даследчыцкі талент: «Ён здагадаўся, што “Сымон-музыка” разбіты на некалькі колаў. І наогул цікава пісаў пра паэму» [10]. Праўда, Колас, акрамя «Фауста» Гётэ, называў яшчэ і «Боскую камедыю» Дантэ, кампазіцыйная пабудова якой у пэўнай меры паслужыла ўзорам для «Сымона-музыкі»: герой праходзіць кола за колам выпрабаванне.

Зусім іншая справа, калі, напрыклад, крытык Я. Камарук праводзіў некаторыя аналогіі паміж кнігай Коласа «На прасторах жыцця», куды ўваходзілі аднайменная аповесць і апавяданні паслярэвалюцыйнага перыяду, і раманам Ф. Гладкова «Цэмент», надзвычай вядомым у 1920-я гады. Несумненна, рэцэнзент пры гэтым дэманстраваў сваю начытанасць і арыгінальнасць, аднак навуковыя вынікі яго супастаўлення былі нязначныя: супастаўляліся, па сутнасці, далёкія мастацкія з’явы, Колас, прыхільнік традыцыйнай манеры пісьма, і Гладкоў, аўтар узорнага ў літаратуры сацыялістычнага рэалізму рамана. Прыблізна тым жа шляхам пайшоў і другі рэцэнзент кнігі С. Замбржыцкі, які згадваў у сувязі з аналізам ідэйнай праблематыкі твораў беларускага празаіка творы П. Раманава, аўтара зборнікаў апавяданняў «Руская душа», «Без чарэмхі» і «Зачараваныя вёскі», і С. Малашкіна, аўтара кнігі «Месяц з правага боку, або Незвычайнае каханне». Пэўныя пераклічкі жыццёвых рэалій, рэха ў падыходзе да іх паказу сапраўды былі, і назіральнасць крытыка вартая высокай ацэнкі, як і імкненне разглядаць беларускія тэксты на шырокім фоне літаратурных падзей паслярэвалюцыйнага часу, аднак ідэйны свет пісьменніка, без уліку мастацкага боку твораў, мае толькі ўскоснае дачыненне да паняцця «параўнальнае літаратуразнаўства». Наўмысныя літаратурныя збліжэнні, як і рэзкае адмаўленне сувязі творчасці Коласа з творчасцю пісьменнікаў, прадстаўнікоў іншых літаратур, у аднолькавай меры мала спрыялі станаўленню беларускай кампаратывістыкі. Элемент перабольшвання быў, напрыклад, у заяве Я. Пушчы: «Я ўпэўнены, што Якуб Колас нічога агульнага не меў з тагачаснай еўрапейскай паэзіяй, як у сэнсе тэматычным, так і ў сэнсе фармальным, мастацкім у традыцыйным разуменні гэтых катэгорый...» [12]. Праўда, заява Пушчы грунтавалася на міжвольнай падмене паняццяў: у тэрміне «неарамантызм» ён убачыў «імпрэсіянізм, сімвалізм, а можа, і футурызм».

Найбліжэй да перагляду метадалагічных перадумоў параўнальнага літаратуразнаўства падышоў А. Вазнясенскі. У сваіх пошуках плённых шляхоў навуковага даследавання ён улічваў вопыт рускай «фармальнай школы» і разумеў, у прыватнасці, што на рэальную глебу параўнальнае літаратуразнаўства стане толькі тады, калі будзе вывучаць літаратуру як мастацтва слова. У артыкуле «Ля вытокаў мастацкай прозы Якуба Коласа» [13] Вазнясенскі адкрыта арыентаваўся на канцэпцыю еўрапейскага рамантызму, якую распрацоўваў В. Жырмунскі. Калі Жырмунскі ў кнізе «Байран і Пушкін» [14] параўноўваў мастацкія асаблівасці «усходніх паэм» Байрана і «паўднёвых паэм» Пушкіна, то Вазнясенскі ўважліва разгледзеў некаторыя кампазіцыйныя прыёмы, выкарыстаныя Коласам у «Сымоне-музыку», і ўбачыў, як шмат агульнага ў беларускага паэта з яго вялікімі папярэднікамі. Да імёнаў Байрана і Пушкіна даследчык дадаў яшчэ і імёны нямецкіх рамантыкаў Л. Ціка, Наваліса, В. Г. Вакенродэра, І. К. Ф. Гёльдэрліна, пашыраючы прадмет даследавання і ствараючы больш поўную карціну гісторыі еўрапейскага рамантызму. Пры гэтым постаць Коласа, убачаная на фоне еўрапейскіх класікаў, не прайгравала, а, наадварот, выйгравала, бо набывала сапраўдны свой маштаб. У тэарэтычнай працы «Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры» [15] А. Вазнясенскі сцвярджаў, што неабходна ўлічваць рэальны стан літаратуразнаўства, бо нацыянальныя асаблівасці «так ці іначай адбіваюцца і на характары адпаведнай гісторыка-літаратурнай навукі», у прыватнасці, абмяжоўвае вучонага даследаваннем асобных пісьменнікаў і робіць немагчымым «агляд літаратуры цэлага народа аказаннем яго этналагічных і генеалагічных асаблівасцей». У той жа час ён заклікаў пераходзіць ад «звычайнага канстатавання фактаў і класіфікацыі іх» да «вышукання законаў і аксіём».

У беларускім літаратуразнаўстве і крытыцы 1930-х гадоў вульгарны сацыялагізм выцесніў усякую сур’ёзную навуковую размову пра мастацкую творчасць. Імя Я. Коласа ў друку нязменна суправаджалі «палітычныя» ярлыкі, накшталт «ідэолаг буржуазнай часткі сялянства», «пасіўны

сузіральнік», а яго творчасць, у адпаведнасці з «класавым падыходам», была перапоўнена «нацыяналістычнай ідэалогіяй нашаніўства», яе характарызавалі «містычнасць, упадніцкая хваравітасць, адрыў ад канкрэтнай рэчаіснасці», «пропаведзь месіянскай ролі інтэлігенцыі». Найбольш даставалася «Новай зямлі», аб'яўленай «аглабельнай» крытыкай «кулацкай». Рэха гэтай зацяжной вайны аўтара за свой твор выразна адчуваецца ў шматгадовай перапісцы Коласа з С. Гарадзецкім, былым сімвалістам і акмеістам, перакладчыкам паэмы на рускую мову, які вымушаны быў так ці інакш рэагаваць на «крытыку». Паэма была выдадзена ў Маскве ў моцна скарочаным выглядзе з прадмовай перакладчыка, у якой выкарыстаны тлумачэнні Коласам зместу, напісаныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага суровага часу: «Фонам для паэмы паслужыла залежнасць лесніка ад капрызнай волі пана-ляснічага, яго несправядлівыя, прыдзірлівыя, часам нічым не апраўданыя адносіны да лесніка» [16]. Толькі пасля гэтай публікацыі прафесійнай крытыцы ўдалося выказаць у друку свае адносіны да «Новай зямлі» (К. Зялінскі, Г. Майфет, А. Ус, М. Ларчанка, Ю. Пшыркоў). Акцэнт пры гэтым рабіўся на тым, што аўтар перагледзеў свае пазіцыі і стаў «песняром новага свету».

Літаратурнае жыццё 1930-х гадоў моцна палітызавалася. Глыбінныя творчыя ўзаемасувязі пісьменнікаў, якія належалі да розных літаратур, усё часцей падмяняліся знешнімі кантактамі, юбілейнымі мерапрыемствамі, прапагандысцкімі паездкамі ў саюзныя рэспублікі. Нягледзячы на мноства публікацый у друку, прысвечаных Пушкіну, Талстому, Гогалю, Радзішчаву, Кальцову, Рылееву і інш., параўнальна-гістарычны метад амаль выйшаў з навуковага ўжытку, а замест літаратурных аналогій звычайна даваўся вялікі пералік імёнаў, за якім нічога не было, акрамя імкнення прадэманстраваць росквіт культур і літаратур народаў СССР у час пабудовы сацыялізму. Тэарэтычны ўзровень, дасягнуты беларускім літаратуразнаўствам ў 1920-я гады, на працягу наступнага дзесяцігоддзя катастрафічна знізіўся. Зрэдку, як глухі водгук, у беларускім друку з'яўляліся асобныя артыкулы: «Някрасаўскія матывы ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа» М. Ларчанкі, «Някрасаў і беларуская літаратура» М. Смолкіна, «Аб жыватворным уплыве рускай літаратуры на беларускую літаратуру» М. Клімковіча і інш. У публікацыях пераважалі дэкларацыі, не падтрыманыя крытычным аналізам з'яў, якія параўноўваліся.

У пачатку 1950-х гадоў цікавасць да праблем літаратурных сувязей узмацнілася. Параўнальнае літаратуразнаўства, паступова пераадольваючы дагматызм і схаластыку, назапашвала канкрэтныя факты і назіранні над асобнымі, напачатку ідэалагічна нейтральнымі, з'явамі творчых дачыненняў паміж рускай, радзей – украінскай і польскай літаратурамі з літаратурай беларускай. У якасці матэрыялу для літаратурных аналогій звычайна прыцягвалася творчасць сучасных рускіх пісьменнікаў. Адной з прычын было тое, што ідэйнае напаўненне і мастацкі ўзровень гэтых твораў не вытрымлівалі параўнання, а ў выніку цень падаў і на сам параўнальны метад. Такім чынам, толькі літаратурная класіка дазваляла паставіць пытанне аб заканамерным узнікненні падобных, аднатыпных тэндэнцый у эстэтычным развіцці розных нацыянальных літаратур.

Імкненнем убачыць творчасць Коласа ў шырокім кантэксце ідэй канца XIX і пачатку XX ст. вылучаецца манаграфія І. Навуменкі «Якуб Колас: Духоўны воблік героя». Кола імёнаў, на фоне якіх разглядаецца творчасць Коласа, значна пашырылася: А. Пушкін, М. Гогаль, Л. Талстой, А. Чэхаў, М. Горкі, А. Купрын, У. Рэймант, С. Лагерлёф, К. Гамсун, Л. Цік, Наваліс, І. В. Гётэ, Г. Сянкевіч, Т. Ман, Р. Ралан і інш. Пералік на гэтым не канчаецца, бо творчасць Коласа савецкага часу сваім ідэйным пафасам, палемічнай сутнасцю і характарам творчага пошуку, несумненна, пераклікаецца з творчасцю многіх класікаў савецкай літаратуры. Аднак важная не колькасць названых імёнаў, а глыбіннае адчуванне Коласаўскай прысутнасці ў сусветным літаратурным кантэксце, што дало вучонаму магчымасць паказаць маштабы пісьменніцкага кругагляду, яго зацікаўленасць фундаментальнымі праблемамі народнага існавання. Менавіта думка пра сувязь Коласа з народным жыццём, якой апантаны даследчык, мае асаблівае метадалагічнае значэнне, калі гаварыць пра літаратурныя аналогіі [17].

У беларускай літаратурнай навуцы, а таксама ў коласазнаўстве, у 1960-я гады заўважаўся якасны зрух у бок тэарэтычнага асэнсавання гісторыка-літаратурных з'яў, метадалагічных праблем. Ужо ў манаграфіі Ю. Пшыркова «Трылогія Якуба Коласа "На ростанях"» вылучаюцца асобныя элементы ідэйна-мастацкай пабудовы твора, дастатковыя для навуковай характарыстыкі яго зместу і формы, той мікракантэкст, які акцэнтуе ўвагу на незаўважаных раней, дадатковых сэнсах

твора. А. Адамовіч у артыкуле «Беларускі раман у вершах (Думкі пра “Новую зямлю”)» зрабіў спробу пашырыць мінімальнае акружэнне, мікракантэкст коласаўскага эпасу, каб асэнсаваць яго сапраўднае месца ў эвалюцыі беларускай літаратуры, у прыватнасці, у станаўленні жанру рамана. Асобнае метадалагічнае значэнне мае зробленае Адамовічам назіранне: «На аўтара “Новай зямлі” адчувальна ўплывае Міцкевіч (“Пан Тадэвуш”) і асабліва аўтар “Яўгенія Анегіна”. Але перш за ўсё нацыянальны шэдэўр вырастаў на народнай глебе, на глебе народнага жыцця, народных уяўленняў аб рэчаіснасці» [18].

Коласаўскія тэксты і падтэксты грунтоўна вывучаліся ў даследаваннях А. Лойкі «“Новая зямля” Якуба Коласа: вытокі, веліч, хараство». Пытанне аб ідэнтычнасці коласаўскіх паэм і кананічным тэксце на шырокім рукапісным і архіўным матэрыяле ўзнімаў М. Мушынскі ў манаграфіі «Ад задумы да здзяйснення: Творчая гісторыя “Новай зямлі” і “Сымона-музыкі”». Асаблівую ўвагу аўтар звярнуў на вершаваныя апавяданні Коласа, з якіх і выраслі яго «раманы ў вершах». Дакладнасць успрымання і інтэрпрэтацыі творчай гісторыі была забяспечана не толькі навуковай добрасумленнасцю і грунтоўнасцю даследчыка, але і набытым за дзесяцігоддзі агульным фондам ведаў аб беларускай літаратуры і яе глыбінных сувязях з іншымі літаратурамі свету. Жанр «творчай гісторыі», «летапісу жыцця і творчасці», заснаваны на фактах і дакументах, атрымаў сваё развіццё ў кнігах М. Мушынскага «Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці», Г. Кісялёва «З жыццяпісу Якуба Коласа: Дакументы і матэрыялы», а таксама ў шматгадовых выпусках «Каласавін», у кнігах В. Жураўлёва, Л. Гараніна, І. Чыгрына, М. Яроша, А. Майхровіча, В. Рагойшы, А. Макміліна, І. Штэйнера і інш.

Коласазнаўства як частка агульнага літаратуразнаўства падрыхтавана ўсебакова і грунтоўна для стварэння абагульненай працы па гісторыі творчых дачыненняў Коласа з рускай літаратурай, якія вызначаліся надзвычайнай глыбінёй і інтэнсіўнасцю на ўсіх этапах яго творчасці. Не толькі навукова-тэарэтычнае, але і грамадска-культурнае значэнне такой працы несумненнае: нягледзячы на зменлівую палітычную кан’юнктуру і прыкметныя ваганні ў духоўных кантактах двух славянскіх народаў, літаратурныя ўзаемасувязі былі заўсёды шматстайнымі і трывалымі, творча плённымі для абодвух бакоў. У выніку яны ператварыліся ў адну з устойлівых традыцый літаратурнага жыцця, якая патрабуе свайго навуковага асэнсавання і тэарэтычнага абгрунтавання. Прычым прадметам даследавання, улічваючы эстэтычныя задачы, якія стаялі перад Коласам, а таксама прырода яго мастацкага таленту, з’яўляюцца творчыя кантакты беларускага класіка з рускімі пісьменнікамі «пушкінскага» і «гогалеўскага» перыядаў. Менавіта ў такім ракурсе павінна вывучацца творчасць Якуба Коласа, аднаго з родапачынальнікаў новай беларускай літаратуры, якая стаіць ля вытокаў мастацкіх адкрыццяў сусветнага значэння. Высокую ацэнку за ўсе гады навуковай і творчай працы атрымаў Якуб Колас як пачынальнік беларускай літаратуры ва ўсіх сферах яе існавання, як адзін з стваральнікаў беларускай літаратурнай мовы, актыўны дзеяч у адраджэнні і станаўленні нацыянальнай культуры. Асаблівую ролю ён адыграў у развіцці беларускай навукі, у дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці, у выхаванні творчай моладзі.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Адамовіч, А. М. Шлях да майстэрства / А. М. Адамовіч. – Мінск, 1958. – С. 9–10.
2. Типология стилевого развития нового времени. – М., 1976.
3. Літ. і маст. – 1955. – 21 мая.
4. Колас, Я. Зб. тв.: у 14 т. / Я. Колас. Т. 13. – Мінск, 1976. – С.71.
5. З жыццяпісу Якуба Коласа: Дакументы і матэрыялы. – Мінск, 1982. – С. 84.
6. Колас, Я. Зб. тв.: у 14 т. / Я. Колас. Т. 1. – Мінск, 1976. С. 89.
7. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе / М. Лужанін. –Мінск, 1964. – С. 135–136.
8. Колас, Я. Зб. тв.: у 14 т. / Я. Колас. Т. 12. – Мінск, 1976. – С. 19.
9. Байкоў, М. Новая беларуская літаратура: Якуб Колас. «Новая зямля» / М. Байкоў // Полымя. – 1923. – № 5–6. – С. 128–129.
10. Бабарэка, А. «Сымон-музыка». Якуб Колас / А. Бабарэка // Узвышша. – 1927. – № 3.
11. Замоцін, І. Творы: Літаратурна-крытычныя артыкулы / І. Замоцін. – Мінск: Маст. літ., 1990.
12. Пушча, Я. Зб. тв.: у 2 т. / Я. Пушча. – Мінск: Маст. літ., 1993–1994.
13. Вазнясенскі, А. Ля вытокаў мастацкай прозы Якуба Коласа / А. Вазнясенскі // Полымя. – 1927. – № 8.
14. Жирмунский, С. Байрон и Пушкин / С. Жирмунский. – М.: Наука, 1978.

15. Вазнясенскі, А. Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры / А. Вазнясенскі. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1927.
16. Колас, Я. Новая земля / Я. Колас. – М.: Худож. лит., 1934.
17. Навуменка, І. Якуб Колас. Духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мінск: Беларусь, 1968.
18. Адамовіч, А. Беларускі раман у вершах (Думкі пра “Новую зямлю”) / А. Адамовіч // ЛіМ. – 1955. – 21 мая.

References

1. Adamovich A. M., *Shliakh da maisterstva: stanaulenne mastatskaga styliu K. Chornaga* [The path to mastery: the formation of the artistic style K. Chorny], Vydavetstva Akademii navuk BSSR, Minsk, BY, 1958.
2. El'sberg Ia. E. (ed.), *Tipologiia stilevogo razvitiia novogo vremeni : Klassich. stil' : Sootnoshenie garmonii i disgarmonii v stile: [Sbornik statei]* [Typology of style development of modern times: Classical. Style: The ratio of harmony and disharmony in style: [Collection of articles]], Nauka, Moscow, RU, 1976.
3. *Litaratura i mastatstva* [Literature and Art], 1955, May 21.
4. Kolas Ia., *Zbor tvorau u 14 t., t. 13* [Collected works in 14 volumes, Vol. 13], Minsk, BY, 1976.
5. Barysenka V. V., Mushynski M. I. (ed.), *Z zhytstsiapisu Iakuba Kolasa: Dakumenty i materyialy* [From the biography of Yakub Kolas: Documents and Materials], Minsk, BY, 1982.
6. Kolas Ia., *Zbor tvorau u 14 t., t. 1* [Collected works in 14 volumes, Vol. 1], Minsk, BY, 1976.
7. Luzhanin M., *Kolas raskazvae pra siabe* [Kolos tells about himself], Mastatskaia litaratura, Minsk, BY, 1982.
8. Kolas Ia., *Zbor tvorau u 14 t., t. 12* [Collected works in 14 volumes, Vol. 12], Minsk, BY, 1976.
9. Baikou M., “New Belarusian literature: Yakub Kolas. "New Land"”, *Polymia* [Flame], 1923, no. 5–6, pp. 128–129.
10. Babareka A., “"Simon the Music" Yakub Kolas”, *Uzvyshsha* [Hill], 1927, no. 3.
11. Zamotsin I., Tvory: *Litaraturna-krytychnyia artykuly* [Works: literary-critical articles], Mastatskaia litaratura, Minsk, BY, 1990.
12. Pushcha Ia., *Zbor tvorau : u 2 t.* [Works in 2 volumes], Mastatskaia litaratura, Minsk, BY, 1993–1994.
13. Vazniasenski A., “At the origins of artistic prose Yakub Kolas”, *Polymia* [Flame], 1927, no. 8.
14. Zhirmunskii S., *Bairon i Pushkin* [Byron and Pushkin], Nauka, Moscow, RU, 1978.
15. Vazniasenski A., *Asnounyia pryncypy pabudovy belaruskaj navuki ab litaratury* [Fundamental princip construction belorusian scince in literature], Minsk, by, 1927.
16. Kolas Ia., *Novaia zemlia* [New land], Khudozhestvennaia literature, Moscow, RU, 1934.
17. Navumenka I., *Iakub Kolas. Dukhouny voblik geroia* [Yakub Kolas. The spiritual aspect of the hero], Belarus’, Minsk, BY, 1968.
18. Adamovich A., “Belarusian novel in verse (Thoughts on the “New Land”)”, LiM [LaA], 1955, May 21st.

Информация об авторе

Тычино *Михаил Александрович* – д-р филол. наук, гл. науч. сотрудник. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: bel-centre@bas-net.by.

Information about the author

Tychino *Mikhail Aleksandrovich,* D. Sc. (Philol.), Chief Scientific Researcher, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: bel-centre@bas-net.by.

Для цитирования

Тычына, М. А. Якуб Колас: нацыянальная класіка ў беларускай і сусветнай літаратуры (Да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа) / М. А. Тычына // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 3. – С. 103–133.

For citation

Tychino, M. A. Yakub Kolas: National Classics in Belarusian and World Literature (To the 135th Anniversary of Yakub Kolas's Birth) / M. A. Tychino // Proc. Natl. Acad. Sci. Belarus: Hum. Ser., no. 3, 2017, pp. 103–133.

ISSN 1024-5928 (print)

ПРАВА

LAW

УДК 347.1+336.7

Поступила в редакцию 21.04.2017
Received 21.04.2017

С. П. Протасовицкий

Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь

ПОНЯТИЕ И ВИДЫ ФИНАНСОВОГО РИСКА

Термин «риск» содержится в понятийном аппарате многих социальных наук. Вместе с тем единства в понимании феномена, обозначенного данным термином, не было и нет. Предметом настоящего исследования выступают понятие финансового риска и его виды.

В основе исследования лежит применение диалектического и логического методов научного познания, позволивших решить поставленные задачи.

Автор обобщает различные научные взгляды на риск и предлагает собственное видение этого явления, на основе чего приводится авторская позиция относительно финансового риска и его видов.

Нежелаемое изменение состояния субъекта всегда имеет достаточное основание. Оно включает причину такого изменения и совокупность условий, при которых причина возникает и действует. Возможность наступления всех условий, необходимых и достаточных для возникновения и действия упомянутой причины, называется опасностью. А основанная на опасности возможность нежелаемого изменения состояния субъекта обозначается термином «риск».

Финансовый риск – это основанная на опасности возможность нежелаемого изменения монетарного состояния социального субъекта. Последнее есть объект финансового риска, а финансовое имущество – его предмет.

По своему предмету он делится на четыре вида: валютный, инвестиционный, кредитный и долговой риски. Дополнительно выделен производный финансовый риск – комплексный образ основных видов финансового риска.

Противоположностью финансового риска выступает финансовый шанс – возможность желаемого изменения монетарного состояния социального субъекта.

Ключевые слова: опасность, риск, шанс, финансовый риск, валютный риск, инвестиционный риск, кредитный риск, долговой риск, финансовый шанс.

S. P. Protasovitsky

Belarusian State University, Minsk, Belarus

CONCEPT AND TYPES OF FINANCIAL RISK

The term "risk" can be found in the conceptual apparatus of many social sciences. However, there has been no common understanding of the phenomenon denoted by this term so far. The object of this research is the concept and types of financial risk.

The research is based on the use of the dialectical and logical methods of scientific knowledge. They made it possible to reach the identified objectives.

The author summarizes different scientific views on risk and suggests his own vision of the phenomenon and his position regarding financial risk and its types.

Any undesirable change in a subject's status always has a valid reason. It includes a cause of such change and a set of conditions under which the cause emerges and becomes effective. The possibility for all the conditions necessary and sufficient for the emergence and effect of the said cause to occur is called "hazard." And the hazard-based possibility of an undesirable change in a subject's status is denoted by the term "risk."

Financial risk is a hazard-based possibility of an undesirable change in a social subject's monetary status. The latter is the object of financial risk, and financial property is its matter.

Based on its matter, financial risk is subdivided into four types: currency risk, investment risk, credit risk and debt risk. Derivative financial risk is additionally identified as a complex image of the main financial risk types.

The opposite of financial risk is financial chance, i.e. a desirable change in the monetary status of a social subject.

Keywords: hazard, risk, chance, financial risk, currency risk, investment risk, credit risk, debt risk, financial chance.

© Протасовицкий С. П., 2017

Введение. Любой, кто управляет финансами, стремится достичь желаемого монетарного состояния. Однако финансы не всегда подвластны воле их субъектов, вследствие чего не исключается возможность нежелаемого изменения такого состояния. Иначе говоря, обладание финансовым имуществом сопряжено с риском.

Под монетарным состоянием мы понимаем принадлежность субъекту определенного количества финансового имущества (табл. 1).

Таблица 1. **Структура монетарного состояния**

Table 1. **Structure of Monetary Status**

Монетарное состояние	
Финансовые активы	*Финансовые пассивы*
Деньги	
Кредитные инструменты	
Долевые инструменты	
Финансовые требования	Финансовые долги

Риск присутствует не только в области финансов, но практически в каждой сфере деятельности. «Жить в эпоху “поздней современности”… – утверждает Э. Гидденс, – значит жить в мире случайности и риска» [1, с. 107]. Естественно, что данное явление вызывает научный интерес. Как пишет В. М. Танаев, «категория риска и ее познание … становится одним из двигателей развития человечества (в философском плане)» [2, с. 16]. В то же время, отмечает В. С. Диев, «сегодня не существует общепринятого определения риска, и представители различных наук друг друга порой просто не понимают» [3, с. 28].

Это понятие возникло в XVII в. в связи с азартными играми. Риск тогда означал вероятность появления некоторого события в сочетании с величиной потерь и выигрышей, которые оно повлекло бы за собой [4, с. 243]. Отсюда понимание риска как возможности (вероятности).

По мнению И. И. Степанова, «риск по интересу есть возможность неосуществления интереса, т.е. возможность неполучения выгоды» [5, с. 77]. С точки зрения М. А. Рогова, «риск – это возможность ненаступления каких-либо ожидаемых событий, возможность отклонения каких-либо величин от некоторых их (ожидаемых) значений» [6, с. 11]. В приведенных суждениях риск связывается с неосуществлением желаемого.

Другие авторы рассматривают риск в контексте негативных последствий (осуществления нежелаемого). Согласно О. А. Красавчикову, риск – это определенная опасность (возможность) умаления имущественных или личных неимущественных благ [7, с. 145]. В представлении А. А. Собчака, «риск – это всегда опасность возникновения неблагоприятных последствий (имущественного или личного характера), относительно которых неизвестно, наступят они или нет» [8, с. 55].

Иную форму понятию исследуемого феномена придает Н. Луман, различающий риск и опасность. Он указывает на две возможные причины возникновения ущерба: «Либо возможный ущерб рассматривается как следствие решения, т.е. вменяется решению. Тогда мы говорим о риске, именно о риске решения. Либо же считается, что причины такового ущерба находятся вовне, т.е. вменяются окружающему миру. Тогда мы говорим об опасности» [9, с. 150]. По Н. Луману, риск субъективен, а опасность объективна. Более тонкое различие между риском и опасностью (в смысле английского exposure) проводит К. А. Хорчер: «Риск относится к вероятности ущерба, тогда как опасность – это возможность ущерба, хотя часто они используются как синонимы» (перевод мой. – *С. П.*) [10, с. 1–2].

В понимании В. А. Ойгензихта риск – не возможность (вероятность) отрицательных последствий поведения или события, а отношение субъекта к ним. По его мнению, риск есть «психическое отношение субъекта к результату собственных действий или к поведению других лиц, а также к возможному результату объективного случая и случайно невозможных действий, выражающееся в осознанном допущении отрицательных, в том числе невозместимых, имущественных последствий» [11, с. 67].

В зарубежной литературе существенной характеристикой риска выступает неопределенность. А. Х. Уиллет, например, называет риск объективным коррелятом субъективной неопределенности [12, с. 29] или объективированной неопределенностью относительно возникновения нежелательного события [12, с. 33]. Ф. Х. Найт термином риск обозначает измеримую неопределенность [13, с. 225]. Практическое различие между категориями риска и неопределенности, на его взгляд, состоит в том, что, когда речь идет о риске, распределение исходов в группе случаев известно либо благодаря априорным расчетам, либо из статистических данных прошлого опыта, тогда как в условиях неопределенности это не так по той общей причине, что ситуация, с которой приходится иметь дело, весьма уникальна, и нет возможности сформировать какую-либо группу случаев [13, с. 225–226].

Многие отечественные авторы понимают риск как поведение (деятельность, деяние, действие, поступок) в условиях неопределенности (выбора). Согласно М. А. Котику, «риск – это действие (поступок), выполняемое в условиях выбора, когда существует опасность в случае неудачи оказаться в худшем положении, чем до выбора» [14, с. 257]. А. П. Альгин видит в нем «деятельность, связанную с преодолением неопределенности в ситуации неизбежного выбора, в процессе которой имеется возможность количественно и качественно оценить вероятность достижения предполагаемого результата, неудачи и отклонения от цели» [15, с. 19–20]. С точки зрения В. И. Зубкова, «риск представляет собой целенаправленное поведение социального субъекта, осуществляемое в обстоятельствах неопределенности ожидаемых исходов» [16, с. 124].

Таким образом, существующие знания о риске подтверждают тезис об отсутствии общепринятого определения данного феномена и вызывают необходимость его дальнейшего научного исследования.

Основная часть. По нашему мнению, риск предполагает несущего его субъекта – физическое лицо, организацию, государство либо их целостную совокупность. Субъект риска всегда находится в том или ином состоянии, а точнее – в состояниях, так как многообразие его свойств предопределяет множество состояний, в которых он может пребывать в конкретный момент. Человек, например, существует в физическом, психическом, социальном, имущественном, юридическом и других состояниях. Они субъекту не безразличны и являют собой объект риска. Свойства субъекта и значимых для него элементов внешней среды мы относим к предмету риска: именно они характеризуют состояние субъекта и обнаруживают его (состояния) изменение.

